ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Сёння апошні дзень падпіскі на II квартал 2009 года

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

28 САКАВІКА 2009 г.
СУБОТА
№ 58
(26416)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Дзяржава цэніць ролю Беларускай праваслаўнай царквы ў захаванні верацярпімасці ў грамадстве

Дзяржава цэніць ролю Беларускай праваслаўнай царквы ў падтрыманні верацярпімасці, міру і згоды паміж людзьмі розных рэлігійных перакананняў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з членамі Сінода Беларускай праваслаўнай царквы.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што высокі аўтарытэт і рознабаковая канструктыўная дзейнасць Беларускай праваслаўнай царквы заўсёды выступалі як важны фактар захавання стабільнасці на беларускай зямлі.

Этапнай падзеяй у развіцці дзяржаўна-царкоўных адносінаў Прэзідэнт Беларусі назваў мінулагоднюю сустрэчу ў Мінску з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Аляксіем II у дні святкавання 1020-годдзя Хрышчэння Русі. «Мы заўсёды будзем памятаць яго як добразычлівага і самага дастойнага сябра і настаўніка, чые мудрасць і аўтарытэт служылі нам надзейнай духоўнай апорай», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што добрыя адносіны, якія склаліся з кіраўніцтвам Рускай праваслаўнай царквы, яшчэ больш умацуюцца ў гады служэння нядаўна выбранага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. На думку Прэзідэнта, для гэтага ёсць усе ўмовы.

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на вялікіх заслугах Беларускай праваслаўнай царквы ва ўмацаванні маральных устояў, адраджэнні духоўнасці, захаванні гістарычных традыцый народа. Царква не адгароджваецца ад рэалій сённяшняга жыцця людзей, узнімае актуальныя сацыяльныя пытанні.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў, што за мінулы год сумесна з БПЦ удалося вырашыць цэлы шэраг важных праблем. У прыватнасці, прыняты комплекс мераў па прадухіленні распаўсюджвання псеўдарэлігійных і акультных ідэй і вучэнняў. Дзякуючы ініцыятыве царквы пры дзейснай падтрымцы дзяржавы адраджаецца шэраг праваслаўных святынь, будуюцца новыя храмы. У краіне ўзводзіцца храм-помнік у гонар Усіх Святых, які, на думку Прэзідэнта, стане агульнанацыянальным здабыткам і мемарыялам. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў краіне не павінна быць недабудаваных аб'ектаў.

Закранаўшы цяперашнія няпростыя эканамічныя ўмовы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў абсалютнае супадзенне пазіцый з царквой наконт крызісу. Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, у яго аснове ляжыць не эканоміка і фінансы, а свядомасць, маральнасць усяго свету. «Гэта больш псіхалагічны, маральны крызіс, чым эканамічны і фінансавы», — сказаў беларускі лідар.

Дзяржава і царква павінны больш актыўна ўзаемадзейнічаць у пытаннях умацавання сямейных каштоўнасцяў, захавання і прымнажэння духоўнай і гістарычнай спадчыны беларускага народа.

Аляксандр Лукашэнка глыбока перакананы, што стваральны патэнцыял царквы далёка не вычарпаны. «Мы чакаем большай актыўнасці ў рабоце з сацыяльна неабароненымі грамадзянамі. З людзьмі, якія імкнуцца пераадолець шкодныя прывычкі, з тымі, хто ўчыніў правапарушэнні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Гэты год у Беларусі аб'яўлены Годам роднай зямлі, і, на думку Прэзідэнта, неацэнную ролю ў навядзенні парадку на зямлі можа адыграць царква. «Яго галоўная мэта — падкрэсліць нашу непарыўную сувязь з Айчынай, з тым каласальным багаццем, якое стагоддзямі стваралася продкамі і за якое цяпер мы ў адказе, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Велізарны вопыт праваслаўя, накоплены на працягу многіх стагоддзяў, мае несумненную каштоўнасць для сучаснасці. Вопыт натхнення людзей, далучэння іх да стваральнай дзейнасці».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў год 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў асабліву значнасць набываюць сацыяльныя праграмы Беларускага экзархата, накіраваныя на адраджэнне традыцый міласэрнасці і дабрачыннасці.

Прэзідэнт Беларусі падтрымаў ідэю выдаваць кандыдатам і дактарам багаслоўя дыпломы дзяржаўнага ўзору.

«Я не зусім разумею, чаму мы не можам вырашыць гэта пытанне, зрабіўшы аднолькавымі гэтыя дыпломы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У нас у свецкай адукацыі сёння развялося столькі ліпавых кандыдатаў, многія з якіх, хутчэй за ўсё, не дацягваюць да ўзроўню багасловаў, якія абараняюць свае дысертацыі». Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным, каб Вышэйшая атэстацыйная камісія (ВАК) выпрацавала сістэму ацэнкі багаслоўскіх дысертацый. «Калі ў ВАКу няма адпаведных спецыялістаў, каб ацэньваць гэтыя работы — давайце запросім туды адпаведных экспертаў, у тым ліку, магчыма, з Расіі і іншых краін», — адзначыў Прэзідэнт.

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гулякa далажыў кіраўніку дзяржавы, што Міністэрства працы Беларусі вырашыла пытанне з даплатамі выкладчыкам, якія маюць багаслоўскую адукацыю. «Сёння размова ідзе толькі аб тым, што Міністэрства адукацыі не выдае кандыдатам і дактарам багаслоўя дыпломы дзяржаўнага ўзору, спасылаючыся на тое, што працэдуры прысваення вучоных ступеняў і званняў у духоўных і свецкіх ВНУ розныя», — праінфармаваў ён.

Прэзідэнт Беларусі лічыць мэтазгодным аднавіць вяшчанне перадачы «Слова пастыра» ў эфірных сетках беларускага тэлебачання.

«Упэўнены, што такая праграма прынясе толькі грамадскую карысць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Таму аднаўленне яе трансляцыі цалкам лагічнае, улічваючы, што гэта задаволіць патрэбы пэўнай часткі нашага грамадства».

Тэлепередачу «Слова пастыра», якая выходзіць у эфіры расійскага тэлебачання, вядзе Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл.

Беларуская праваслаўная царква заклікае ўвесці дзейснае прававое рэгуляванне інтэрнэту. Аб гэтым заявіў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Мітрапаліт Філарэт лічыць, што ў Беларусі можа быць карысны вопыт іншых краін, у прыватнасці Кітая, дзе на заканадаўчым узроўні ўведзена адказнасць тых, хто прадастаўляе доступ у Сусветную сетку.

Беларуская праваслаўная царква лічыць неабходным уключыць у школьныя падручнікі па базавых дысцыплінах духоўна-маральны кампанент. З такой ініцыятывай да кіраўніка дзяржавы звярнуўся Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

На думку Мітрапаліта Філарэта, у карэкціроўцы маюць патрэбу падручнікі па такіх прадметах гуманітарнага цыкла, як беларуская і руская мовы і літаратуры, гісторыя, выяўленчае мастацтва. Паводле яго слоў, на працягу дзесяцігоддзяў з творчасці вялікіх пісьменнікаў, паэтаў, кампазітараў, мастакоў скрупулёзна адбіралася пераважна сацыяльна-палітычная інфармацыя, а духоўнаму боку ўдзялялася недастаткова ўвагі. Ён таксама дадаў, што царква ў вырашэнні гэтага пытання гатова прыняць самы дзейсны ўдзел.

Мітрапаліт Філарэт падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за падтрымку выказанай на мінулай сустрэчы з Сінодам ідэі стварэння грамадскага савета па маральнасці з удзелам выдатных дзеячаў мастацтва, навукі. Прадстаяцель Беларускай праваслаўнай царквы папрасіў аказаць дзейсную падтрымку ў рэалізацыі яшчэ аднаго праекта — выпуску факсімільнага выдання Слуцкага Евангелля. Паводле слоў Філарэта, па значнасці гэту святыню беларускага народа можна параўнаць з Крыжам прападобнай Ефрасінні Полацкай. У 1581 годзе гэта Евангелле ўласнаручна перапісаў князь Юрый Алелька. Выпуск факсімільнага выдання даў бы магчымасць зрабіць яго тэкст даступным як даследчыкам, так і шырокаму колу людзей, якія цікавяцца гісторыяй і духоўнай культурай.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

На тэрыторыі Беларусі 29 сакавіка ў 2 гадзіны стрэлкі гадзіннікаў пераводзяцца на адну гадзіну наперад. Такім чынам будзе ажыццёўлены пераход на летні час.

НА ЛЕТНІ ЧАС

За атрыманы газ Беларусь разлічылася поўнасцю

Гэты год у параўнанні з мінулым будзе больш цяжкім, выказаў меркаванне на прэс-канферэнцыі ў Мінску старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар БАБАРЫКА, каментуючы наступствы сусветнага крызісу. Разам з тым, банкір адзначыў і наступнае: « Тое, што мы назіраем у эканоміках суседніх краін, у першую чаргу ў Расіі, сведчыць — самы час прыходзіць да стабілізацыі. Гэта не значыць, што 2009 год будзе тым годам, калі эканоміка будзе расці і развівацца ўверх, але тое, што гэты год, згодна з аптымістычным сцэнарыем, будзе самым цяжкім годам, — дакладна. У наступным годзе так цяжка ўжо не будзе».

А вось каментуючы інфармацыю наконт аплаты нашай краінай паставак «блакітнага паліва» расійскаму боку за першыя два месяцы гэтага года, **намеснік праўлення расійскага ААТ «Газпрам» Андрэй КРУГЛОЎ** развянчаў міфы пра нейкую запазычанасць Беларусі за энерганосьбіты. У прыватнасці, ён падкрэсліў, што Беларусь за студзень-люты поўнасцю разлічылася за атрыманы газ. «Іншага, — заўважыў ён, — мы і не чакалі».

Што ж датычыцца найбольш таямнічага на сёння пытання, а менавіта — колькі наша краіна плаціць за спажыты расійскі газ? — **генеральны дырэктар ААТ «Белтрансгаз» Уладзімір МАЁРАЎ** заявіў: «Маюць рацыю тыя, хто кажа, што цана ў 2009 годзе будзе меншай за 160 долараў за 1 тысячу кубічных метраў газу, але гэта паняцце сярэднеарыфметычнай цаны». Між іншым, у прыватнай гутарцы журналістаў з адказнымі асобамі расійскага боку не выключалася і тое, што цана газу для нашай краны можа быць некалькі меншай за згаданую лічбу ў 160 долараў. Дарэчы, паводле прагнозаў экспертаў, на працягу сёлетняга года цана на газ будзе знікацца, калі не адбудзецца нейкіх хістанняў у бок росту цэнаў на нафту.

Іншае пытанне, якімі грашыма будзе весціся разлік. Як узгадаў Уладзімір Маёраў, летась каля 70 % разлікаў праводзілася расійскімі рублямі. Хоць у кантракце замацаваная магчымасць разлікаў як у доларах, так і ў еўра і расійскіх рублях. Тым не менш, Беларусь гатовая разлічвацца на 100 працэнтаў за спажыты газ расійскімі рублямі. Паводле слоў Уладзіміра Маёрава, гэта з'яўляецца перспектыўным з улікам атрымання нашай краінай расійскіх крэдытаў і вядзення перамоў аб выкарыстанні расійскай валюты ў якасці рэгіянальнай валюты. Да таго ж, як вынікае са слоў намесніка дырэктара Газпрама Андрэя Круглова, расійскі бок вельмі зацікаўлены ў пашырэнні разлікаў з выкарыстаннем іх нацыянальнай валюты. У сваю чаргу Уладзімір Маёраў адзначыў, што нашай краінай вядзецца праца па актывізацыі экспарту. У тым ліку і з Газпрамам наконт пастаўкі яму неабходнай айчыннай тэхнікі. Праз актывізацыю экспарту, на яго думку, ёсць магчымасць атрымаць валюту, каб разлічыцца з Газпрамам.

Канстатуючы паспяховыя вынікі леташняй працы Белгазпрамбанка, Андрэй Круглоў абверг чуткі наконт перамоў, што вядуцца аб набыцці Газпрамам кантрольнага пакета акцый Белтрансгаза. У прыватнасці, ён паведаміў, што ў адпаведнасці з падпісаным пагадненнем доля Газпрама павінна быць павялічаная да 50 %. Іншыя змяненні ў гэтае пагадненне пакуль не прадугледжваюцца. «Мы дзейнічаем, — заўважыў ён, — згодна з дамоўленасцямі». З іншага боку, паводле яго слоў, калі сітуацыя ў Беларусі, Расіі і свеце зменіцца, то бакі гатовыя абмеркаваць раней дасягнутыя дамоўленасці.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

***Раіса АНАНІЧ** больш за 20 гадоў працавала спецыялістам аддзела гарантыйных рамонтаў на Мінскім гадзіннікавым заводзе, цяпер яна — загадчык выставачнай залы-музея, у якім больш за тры тысячы экспанатаў, маркіраваных вядомым лагатыпам «Луч». Гэта адзінае прадпрыемства на тэрыторыі СНД, дзе адбываецца поўная вытворчасць розных тыпаў гадзіннікаў.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

2 красавіка 2009 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) пачне работу другая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Другая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю працу **2 красавіка 2009 года а 10-й гадзіне** ў зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 красавіка 2009 года з 9.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

Прамыя лініі

АНКАЎРАЛОГІЯ І АНКАГІНЕКАЛОГІЯ

Дыягностыка і лячэнне анкалагічных захворванняў, у прыватнасці, анкаўралагічных (прастата, мачавы пузыр, ныркі) і анкагінекалагічных (рэпрадуктыўная сістэма жанчын) будуць у цэнтры ўвагі нашай чарговай «прамой лініі» па медыцынскай тэматыцы. На вашы пытанні адкажуць спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава — **намеснік дырэктара па навуковай працы, доктар медыцынскіх навук Сяргей Анатольевіч КРАСНЫ** і **загадчыца аддзела анкагінекалогіі, доктар медыцынскіх навук Ірына Аляксандраўна КАСЭНКА.** «Прамая лінія» адбудзецца 30 сакавіка, у панядзелак, з 14.00 да 15.00 па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

УСЁ ПРА РАЗМЕРКАВАННЕ

Размеркаванне — не менш адказны час у жыцці маладых людзей, чым прыёмная кампанія. Ці абавязана камісія па размеркаванні задавальняць персанальныя заяўкі арганізацый на выпускніковў? Ці павінна брацца пад увагу сямейнае становішча выпускніка? Якія прывілеі дае выпускнікам статус маладога спецыяліста? Якія могуць быць падставы для пераразмеркавання? Ці можна апратэставаць вынікі размеркавання? Як размяркоўваюцца выпускнікі магістратуры? На ўсе пытанні, якія датычацца забеспячэння маладых людзей першым працоўным месцам і працы па размеркаванні, вам адкажуць **старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА** і **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК,** з якімі «Звязда» арганізуе заочную «прамую» лінію.

З пытаннямі можна звяртацца ў рэдакцыю па нумары (017) 287 17 41 (Надзея НІКАЛАЕВА).

САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА: КАМУ І НА ЯКІХ УМОВАХ?

Адрасная сацыяльная дапамога, падтрымка маламаёмных грамадзян, ветэранаў і інвалідаў — усе гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Пятроўны СЯРГЕЕВАЙ, начальніка аддзела па справах інвалідаў Рыты Валянцінаўны СУШКО і начальніка аддзела па справах ветэранаў Івана Пятровіча НАГІБІНА.**

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» пройдзе 14 красавіка з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэдне пытанні можна пакінуць па нумары (8 017) 287 17 57.

СЛОВА АД СЭРЦА

Госці і жыхары сталіцы 26 сакавіка на Кастрычніцкай плошчы маглі паўдзельнічаць у творчай справаздачы рэгіёну, які па праву называюць Сэрцам Беларусі. Міншчына наладзіла шырокае народнае гулянне-кірмаш, які прадэманстраваў, наколькі багаты і разнастайны гэты рэгіён на традыцыі, культурныя дасягненні і таленавітых людзей. Тут было што і паглядзець, і купіць, было чым і пасмакаваць.

За ўсім гэтым дзействам стаіць вялізная работа вялікай колькасці людзей у галіне культуры. Спецыфіка Мінскай вобласці ў тым, што абсалютная большасць культурных установ тут знаходзіцца ў сельскай мясцовасці, а традыцыйная культура прадстаўлена некалькімі арэаламі.

— Міншчына ганарыцца тым, як на яе тэрыторыі развіваецца аматарская творчасць, — расказаў на прэс-канферэнцыі, якая папярэднічала мерапрыемству, **начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Анатоль АКУШЭВІЧ.** — У вобласці каля пяцісот народных калектываў, якія маюць званне ўзорных і заслужаных.

На канцэрце можна было пачуць і ўбачыць усе лепшыя калектывы Мінскай вобласці. У тым ліку і тыя, што прынеслі славу не толькі рэгіёну, але і краіне. Летась лаўрэатамі Міжнародных фестываляў сталі ўзорны ансамбль танца «Канфеці» са Слуцка, народная вакальная студыя Палаца культуры горада Барысава, ансамбль народнай музыкі «Кірмаш» з Мінскага раёна, народны ансамбль танца «Сузор'е» з Салігорска. Народны фальклорны калектыў «Гасцінец» з Валожыншчыны стаў пераможцам некалькіх міжнародных форумаў і быў узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Высокія ўзнагароды прывезлі ў 2008 годзе і калектывы, якія створаны на базе навучальных устаноў Мінскай вобласці. Гран-пры Міжнароднага фестывалю-конкурсу «Хрустальная ліра» (Францыя) і дыплом лаўрэата I ступені Міжнароднага фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік» атрымаў народны аркестр беларускіх народных інструментаў «Ліра» Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў...

Сфера культуры Мінскай вобласці ўключае ў сябе таксама працу музеяў, бібліятэк, клубаў, догляд помнікаў, работу з ветэранамі...

— Дзякуючы таму, што за два апошнія гады па ўсіх кірунках сферы культуры было зроблена нямала, мы пакуль не павінны адчуць наступствы сусветнага фінансавага крызісу, — лічыць начальнік упраўлення культуры Мінскай вобласці. — Былі пабудаваны новыя і рэканструяваны старыя будынкі, добраўпарадкаваны тэрыторыі, набыты камп'ютары для бібліятэк, музычныя інструменты, апаратура, касцюмы для дамоў культуры, адноўлены экспазіцыі ў музеях...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На вясёлы кірмаш з 50 лялькамі прыехаў Квасыніцкі цэнтр рамёстваў Слуцкага раёна. На фота: дырэктар цэнтра Наталля Казіміраўна МАТУСЕВІЧ.

Ужо самой сваёй прысутнасцю на кірмашы губернатар Мінскай вобласці Леанід КРУПЕЦ дэманструе, што сфера культуры займае важнае месца ў жыцці рэгіёна.

ПАРЛАМЕНЦКАЯ КУХНЯ

ПРА ПАЛІТЫКУ СА СМАКАМ

Карціну парламенцкага жыцця мы міжволна прызвычаіліся афармляць у шэрых танах. У гэтай палітры не стае настраёвасці. Нам хочацца ведаць не толькі тое, як заканадаўцы змяняюць уклад нашага жыцця, але і тое, якія яны — людзі, што прадстаўляюць нашы інтарэсы. Чым захапляюцца, як адпачываюць, нарэшце, што ядуць. Нездарма ж бытуе меркаванне: мы — тое, што мы ядзім. У сэнсе, адзін усё соліць і перчыць, не шкадуючы, а другі ласуецца катлеткамі на пары. Ды і сам па сабе працэс гэты досыць асабісты, так што сумеснае частаванне збліжае людзей. Нездарма ж многія важныя перамовы вядуцца за дзелавым абедам. Ну а сумеснае прыгатаванне пачастунку тым больш дазваляе людзям раскрыцца. Дык чаму б нам не пакулінарыць разам з парламентарыем? А за працэсам гатавання не абмеркаваць кухню парламенцкую — як працуецца над будучымі законамі? Што ж, прыступім і будзем спадзявацца, што наша першая газетная страва не атрымаецца комам!

Прэм'ера рубрыкі

РАЗМАРОЗІЦЬ ІПАТЭКУ

Дэпутаты спрабуюць «падагрэць» жыллёвы рынак

Мы пераступаем ганак кватэры, з якой проста не хочацца сыходзіць — ці то з-за шчырай гасціннасці яе ўладальніка, ці то з-за ўтульнасці, а мо якраз гэтага ўдалага спалучэння. Цёплыя тоны, прыемныя фактуры, адна сакавіта-аранжавая канапа чаго вартая! Над інтэр'ерам — заўважна — працаваў прафесіянал: які дэкор, якая ўвага да дэталяў, якая гульня з прасторай! Замест дзвярэй — сімвалічныя перагародкі, кухня і сталовы пакой арыентаваныя на поўнач, гасціная з кабінетам — на поўдзень, спальня (прыватная зона) нібы схавана ў глыбіні кватэры ад вока выпадковага наведвальніка, у вузкім засценку — люстэрка на ўсю сцяну, каб візуальна пашырыць прастору. І ўсё гэта ў звычайнай хрушчоўцы. Мы не здзіўляемся, калі даведваемся, што перапланіроўку распрацавала сама гаспадыня — прафесійны архітэктар. Кватэра адпавядае характару ўладальніцы — яна досыць адкрытая, аднак, не для кожнага і не ўсё тут выстаўляецца напаказ, яна па-жаноцку ўтульная, але пры гэтым тэхнічна вывераная — кожная дробязь на сваім месцы, каб усё было сістэмна, каб аптымізаваць жыццё.

Вы, пэўна, ужо здагадаліся, у каго мы гасцюем? Так, у **Галіны ПАЛЯНСКАЙ, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі,** якая ў ранейшым, дадэпутацкім, жыцці прайшла шлях ад асістэнта да дэкана архітэктурнага факультэта БНТУ, дзе і сёння працягвае працаваць на паўстаўкі прафесара на кафедры архітэктурнага дызайну. Парламентарыі, між іншым, часта звяртаюцца да Галіны Уладзіміраўны па парады, як уладкаваць дом...

Фота Вольі ЛАСКІ.

На дварэ вельмі сонечна, і цёплыя тоны ў інтэр'еры літаральна зіхацяць — тым лягчэй уявіць сябе дзе-небудзь на Сіцыліі. Гаспадыня ж падзеліцца з намі рэцэптам лазанні — традыцыйнай стравы італьянскай кухні. Гатаваць арыгінальны ласунак Галіна Палянская навучылася якраз у Італіі — часта бывала там у рабочых паездках. У той час, калі яна з'яўлялася экспертам культурна-адукацыйнага фонду Рамуальда дэль Б'янка, шмат студэнтаў і выкладчыкаў факультэта атрымалі магчымасць пазнаёміцца з італьянскім досведам, пасля кантакты завязаў і Беларускі саюз архітэктараў. Нашы сябе таксама паказалі: «Італьянцы кажуць, што я адкрыла ім акно ў краіны Садружнасці. Я запрасіла іх у Беларусь, калі мы праводзілі тут міжнародны конкурс дыпломных праектаў, сабралася вялікая архітэктурная тусоўка». Не абышлося без кур'ёзаў: «Па-італьянску маё імя перакладаецца як «курыца», і яны прыдумалі зваць мяне Гала — свята, феерверк. Ты, кажуць, камунікабельная, актыўная, табе гэта больш пасуе».

Італьянская кухня палюбілася Галіне Уладзіміраўне не толькі з-за смаку і карыснасці, але яшчэ і таму, што простая ў прыгатаванні. Для дзелавой жанчыны лепшае і прыдумаць цяжка. Гасцям (а на святы ў Галіны Уладзіміраўны збіраюцца шумныя кампаніі чалавек па дваццаць) лазанню забяспечана — гэта каронная страва гаспадыні. «Зараз пост, таму мясную лазанню гатаваць сёння не будзем. Зробім рагу з грыбамі». Дарэчы, гаспадыня не аматарка кулінарных шоу, апроч хіба што майстар-класаў Барыса Бурды — надта ж цікавыя і познавальныя. Затое неабыякавая да інтэр'ерных штучак, прафесійных часопісаў і мастацкай літаратуры. «Зараз я ўзяла невялікі тайм-аут, працоўны адпачынак на два тыдні, чытаю запоем».

(Заканчэнне чытайце на 6-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

09058

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.03.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 794,00
▼ 1 еўра	3 786,71
1 латвійскі лат	5 337,15
1 літоўскі літ	1 095,99
1 чэшская крона	139,46
1 польскі злоты	823,70
▲ 1 расійскі рубель	83,62
1 украінская грыўня	347,08

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	33,4133
10 UAH	41,5072
1000 BYR	11,9547
EUR	45,3151

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

УНУТРЫ ВЯЛІКАГА

Будаўнікі, якія яшчэ нядаўна хадзілі ў Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі на працу, сталі аднымі з першых яго гледачоў. Але на дабрачынны канцэрт абноўленаму тэатр запрасіў і сваіх ветэранаў, якія ў ранейшыя гады выступалі ў гэтых сценах.

Гэтага чакалі і адны, і другія, ды і сам тэатр, які быў падзелены на оперную і балетную частку і туліўся на розных пляцоўках. І артысты, якія марылі пра тое, як вернуцца дадому і стануць працаваць у нармальным рэжыме. Дзеля таго, каб гэта адбылося як мага хутчэй і тэатр хутчэй абжыўся ў новых умовах, дзяржава, паводле словаў першага намесніка міністра культуры Уладзіміра Рылаткі, выдаткавала немалую суму — каля 1 мільёна долараў.

— Мы працуем зараз ва ўмовах, якія патрабуюць гераізму, — патлумачыў галоўны дырыжор тэатра заслужаны артыст Украіны Віктар Пласкіна. — Нашы тэхнічныя службы па 20 гадзін працуюць, асвойваючы новае абсталяванне. Калі яшчэ ішоў рамонт, многія, і я ў тым ліку, казалі, навошта такая спешка? Але потым зразумеў: калі не паставіць канкрэтны тэрмін здачы (8 сакавіка), то немаведама калі ўсё скончыцца, магчыма, гэта адбылося б толькі 8 сакавіка наступнага года.

Галоўнае, што ўжо можна паступова адаптавацца ў новых умовах. Прасцей гэта будзе зрабіць балетнай трупе — усё-такі падчас рамонту яна працавала на вялікай сцэне Палаца Рэспублікі, таму дэкарацыі будзе прасцей перанесці ў тэатр.

— Умовы для гледачоў палепшыліся, — адзначыў Валерый Гедройц, дырэктар опернай трупы. — А таксама і для творчых супрацоўнікаў, якія працуюць над стварэннем новых спектакляў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Як нас дураць

БЯСПЛАТНАЯ ПРАЦА НА ТРЫ ДНІ

Ты адпрацоўваеш тры васьмігадзінныя працоўныя дні — і ўсё, паехаў: хтосьці самастойна робіць рашэнне кінуць працу, а кагосьці проста не бяруць: маўляў, вы не ўкладваецеся ў запланаваную колькасць…

Справа з прыёмам на працу, апошнім часам, выклікае больш адказаў, чым пытанняў, бо працадаўцы ідуць на ўсё большыя хітрыкі, каб атрымаць падчас крызісу ранейшы прыбытак. «На добрага жыўца і рыба добрая», — кажа народнае выслоўе, гэтак атрымалася і з адным маладым чалавекам…

Рэч у тым, што Дзяніс звольніўся з працы якраз тады, калі фінансавы крызіс пачаў сунуцца на Беларусь. Не маючы нейкіх спецыялізаваных ведаў да працы ў прафесійнай галіне, ён вырашыў, як і многія беларусы, шукаць шчасця ў газетах-абвестках. Там жа яго чакала прывабная аб'ява, у якой на працу запрашаліся кур'еры са сталым заробкам каля 56 тысяч у дзень, пры ўмове 5-6 штодзённых заказаў, не больш за 10 кілаграмаў кожны. А таму малады чалавек і вырашыў паспрабаваць.

На гутарцы, пра якую даведаўся па тэлефоне, прысутнічала каля сарака чалавек, кожны з якіх запаўняў анкету, а пасля адразу ішоў да «менеджара па кадрах». Апошні яшчэ раз тлумачыў правілы і прапаноўваў выбрацъ, кім вы жадаеце быць: кур'ерам ці кур'ерам-кансультантам (пасада апошняга адрознівалася толькі тым, што вам прапаноўваліся некалькі працэнтаў ад прыбытку фірмы за прададзеную прадукцыю). Прычым было заўважана, што калі на рынках нармальныя працэнты знаходзяцца ў дыяпазоне 10 працэнтаў, то на УП «Падман» (назавём яго так) яны былі роўныя 30 працэнтам. Вядома, што пры такім раскладзе, выбар на карысць кансультанта быў амаль відавочны...

— Наступным днём нас размеркавалі ў групы па 4-5 чалавек, у кожнай з якіх быў адзін чалавек, які ўжо працаваў на гэтае прадпрыемства. Ну, і кажуць, што нам трэба кожны дзень прыходзіць у офіс, забіраць кніжкі, якія нам спадабаліся, і, так бы мовіць, упарад. Вось, гэтак і паехалі, — распавядае Дзяніс. — У першым будынку, што трапіўся на вочы, трэба было заходзіць ва ўсе кабінеты і казаць, нешта кшталту: «Прывітанне! Мы — афіцыйнае прадстаўніцтва фірмы «Падман». Паглядзіце, калі ласка, кнігі...»

І ўсё б добра, каб не адно «але»: калі чалавек ходзіць такім чынам нават поўны дзень, але так здарылася (і, найхутчэй, будзе), што ён не збыў ніводнай кнігі, то... і зарплаты ён аніякай не атрымае — а пра гэта новападрыхтаваных кур'ераў-кансультантаў ніхто не папярэджвае! Мала таго, ніякіх працоўных дамоваў прадстаўнікі «Падману» таксама не заключалі з кур'ерамі, а гэта значыць, што апошнія маглі ў любую хвіліну выгнаць, не заплаціўшы за ўвесь тэрмін працы. Калі ж адзін з нас пазваніў па тэлефоне аб'явы, назваўшыся зацікаўленай у працы асобай, дык на пытанне, ці заключаюць працоўныя дамовы, давялося пачуць: «Ну, гэта, як бы, усё абмяркоўваецца з менеджарам па кадрах». Дзянісу ж застаецца толькі разводзіць плячыма, бо падобных гутарак ён і не чуў нават.

— У рынцыпе зарабляць грошы на гэтым можна, — ацэньвае малады чалавек, — але пры ўмове ўжо складзенай кліентуры, дзеля чаго трэба спярша самому шмат грошай укласці. Быць кур'ерам увогуле не мае сэнсу, бо на паліва ў машыне пойдзе больш грошай, чым заплацяць... А могуць жа і не заплаціць!

Як і атрымалася. Так, адпрацаваўшы тры дні, Дзяніс не атрымаў ніводнага рубля. Гэта і навяло яго на сумныя развагі аб тым, што калі ён нават вытрымае выпрабавальны тэрмін у 25 дзён, дык яго ўсё адно змогуць звольніць, бо, паводле дамовы, ён павінен нагандлёўваць за дзень на 280 тысяч, што, па шчырасці, малаверагодна. А таму, ён вырашыў неадкладна кінуць «працу»... Працадаўцы, бадай, і не надта засмуціліся...

Сапраўды, «на добрага жыўца і рыба добрая»! Дык ці ж хочаце вы быць той рыбай, якую потым за вячэрай з'есць рыбалоў або прадасць браканьер? Таму **ніколі не «клюйце» на вялікую плату за лёгкую працу! І заўжды заключайце працоўную дамову!**

Мікола ТАМАШЭВІЧ.

Кватэра на «працяглы тэрмін»

Як мінімум 11 чалавек пацярпелі ад дзейнняў махляркі, якая арудавала ў Гродне «пад шыльдай» здачы ў наём кватэры.

Паводле інфармацыі з Ленінскага РАУС г. Гродна, пакуль не выяўленая жанчына праз рэкламную аб'яву сама зняла кватэру на кароткі час, пасля чаго ў той жа дзень стала прапаноўваць яе іншым, ужо на працяглы тэрмін. Попыт на гэту прапанову быў вялікі. Людзі ўносілі папярэднюю аплату за два-тры месяцы, але пры гэтым нават не цікавіліся дакументам аб праве ўласнасці на гэта жыллё. А пашпарт, які паказвала махлярка, як высветлілася, быў згублены жыхаркай Магілёва паўгода назад.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельного участка общей площадью 45,2011 га сроком на 99 лет для строительства спортивно-туристического комплекса с объектами соцкультбыта, расположенного по адресу: Минский район, Папернянский с/с, 100 м. восточнее д.Семково. Кадастровый номер земельного участка 623685500001000418. Начальная цена – 29 811 451 090 бел. рублей. Земельный участок имеет ограничения в использовании земель (прибрежная полоса (27,60 га) и водоохранная зона Заславского водохранилища). **Аукцион проводится со следующим условием:** победитель аукциона должен обеспечить беспрепятственный проезд (проход) к причалу.

Участник аукциона, ставший Победителем, обязан:

1. в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить убытки в сумме 39 338 348 рублей, причиненные изъятием земельных участков, потери сельскохозяйственного производства в сумме 2 654 730 955 рублей, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы в сумме 6 285 322 рубля, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона;

2. заключить с Минским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить государственную регистрацию возникновения права на этот участок;

3. получить в установленном порядке разрешение Минского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

4. в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставленный земельный участок приступить к занятию данного участка;

5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проекту рекультивации;

6. осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией и согласованные с Минским облисполкомом.

Договор аренды земельного участка заключается с Победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после совершения Победителем аукциона действий, указанных в пункте 1 настоящего извещения. Рассрочка по внесению платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в соответствии с порядком, утвержденным решением Минского облисполкома от 20.06.2008 г. № 686.

Перечень документов, которые необходимо представить для участия в аукционе, и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения. В соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, согласно которому участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его подготовку и проведение в размере 0,25 процента от начальной цены предмета торгов. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельным участком. Задаток в сумме 500 000 000 рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Аукцион состоится **30 апреля 2009 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23 апреля 2009 года до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 324.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Уладзімір НАВУМАЎ:

«МЕСЦАЎ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ Ў БЕЛАРУСІ КРЫЗІС НЕ ДАТЫЧЫЦЦА»

Перад пасяджэннем калегіі МУС Беларусі, якая адбылася ўчора на базе Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра МУС, міністр Уладзімір НАВУМАЎ выказаў пазіцыю міністэрства і свой асабісты погляд на нашумелыя падзеі.

Пра пазбаўленне волі і альтэрнатыўныя меры пакарання

— Колькасць асуджаных у месцах пазбаўлення волі з кожным годам няўхільна зніжаецца. Калі 10 гадоў таму за краты накіроўвалі кожнага трэцяга асуджанага, то сёння туды трапляе толькі 1 з 5. Астатнія правапарушальнікі адбываюць пакаранні, не звязаныя з пазбаўленнем волі. Ні ў адной краіне СНД няма такой колькасці альтэрнатыўных відаў пакарання, як у Беларусі. І надалей мы будзем ісці насустрач людзям, якія спатыкнуліся ўпершыню і яшчэ могуць стаць на шлях выпраўлення.

Пра амністыю і крызіс

— Законапраект аб амністыі плануецца разгледзець у парламенце 16 красавіка. Калі ён будзе прыняты, то да канца красавіка ў месцах пазбаўлення волі неабходна будзе правесці комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на тое, каб нашы месцы пазбаўлення волі адпавядалі ўсім міжнародным стандартам і новым умовам работы (бо колькасць асуджаных будзе значна меншай). Што ж тычыцца фінансавання ўстаноў пенітэнцыярнай сістэмы краіны, то месцаў пазбаўлення волі ў Беларусі крызіс не датычыцца. Сёння ў месцах пазбаўлення волі краіны 100 % асуджаных працуюць, яны ў стане самі на сябе зарабіць — як на кампенсацыю судовых іскаў, так і на пражыванне.

Пра ініцыятыву Генеральнай пракуратуры

— Зараз аддзелам па справах няпоўнагадовых і моладзі Генпракуратуры разглядаецца магчымасць унясення зменаў у заканадаўства, якія тычацца забароны дзецям да 14 гадоў у начны час знаходзіцца ў грамадскіх месцах без суправаджэння дарослых. Гэта не новая ініцыятыва. І зараз у некаторых рэгіёнах краіны мясцовыя ўлады прымаюць рашэнні, што дзеці да 14 гадоў без суправаджэння дарослых пасля 22.00 ці 23.00 гадзін не могуць знаходзіцца ў грамадскіх месцах. Я думаю, што ў адказных бацькоў дзеці да 14 гадоў і так у позні час знаходзяцца пад наглядам. Гэта датычыцца ў асноўным цяжкіх падлеткаў. Мяркую, што гэту ініцыятыву падтрымаюць дарослыя людзі, ды і самі дзеці нармальна паставяцца да новаўвядзення.

Пра вулічную акцыю апазіцыі, якая прайшла 25 сакавіка ў Мінску

— Нічога сур'ёзнага не адбылося. Былі, безумоўна, незадаволеныя тым, што супрацоўнікі міліцыі выстраіліся ланцужком, каб перагарадзіць шлях на праезную частку. Гэта было зроблена, каб падтрымаць парадак у горадзе. Бо дзе гарантыя таго, што маладыя людзі валодаюць сабой настолькі, каб прайсці па тратуары і нікога не зачапіць. Я адзначыў для сябе, што сярод удзельнікаў мерапрыемстваў апазіцыі ўсё больш і больш асобаў, якія яўна і самі не разумеюць, для чаго сабраліся. Толькі адно ў галаве — як бы пахуліганіць. Ёсць відэаматэрыялы, на якіх зафіксаваны факт спальвання партрэта Прэзідэнта Беларусі. Дзеянням людзей, якія гэта зрабілі, пракуратурай будзе дадзена прававая ацэнка.

Пра былога дырэктара гандлёвага дома «Ждановічы»

— Былы генеральны дырэктар гандлёвага дома «Ждановічы» Яўген Шыгалаў (абвінавачваецца па артыкуле «Арганізацыя злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, якія пацягнулі за сабой цяжкія наступствы ў выглядзе прычынення дзяржаве ўрону ў асабліва буйным памеры». Гаворка ідзе аб Br85 млрд) вярнуў частку скрадзеных грошай. «Зараз распрацоўваецца графік, па якім астатнія грошы будуць кампенсаваны ў найбліжэйшы час. Паколькі на прадпрыемстве працуе вялікая колькасць людзей, прынялі рашэнне ўзаконіць зямлю, якая была незаконна прысвоена (мужчына самавольна будаваў аб'екты на тэрыторыі комплексу).

Пра электронныя бранзалеты для асуджаных

— Гэта вельмі дарагое «задавальненне». Для прымянення ў Беларусі электронных бранзалетаў неабходна стварыць асобную службу і вырашыць мноства іншых пытанняў. Таму прымяняць электронныя бранзалеты ў нашай краіне ў найбліжэйшы час не плануецца.

Надзея ДРЫЛА.

Антыкрызісная эканоміка

БІЗНЭСУ НЕ СТАЕ СВАБОДЫ ДЗЕЯННЯЎ

Актывізацыя работы з малым і сярэднім бізнэсам у Беларусі дасць магчымасць атрымаць дадатковыя рэсурсы для краіны, лічыць старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Уладзімір КАРАГІН. З некаторымі прапановамі першачарговага характару, якія ўтрымліваюцца ў Нацыянальнай платформе бізнэсу Беларусі, распрацаванай саюзам, яго кіраўнік мяркуе выступіць на пасяджэнні Грамадска-кансультацыйнага савета, створанага пры Адміністрацыі Прэзідэнта. На думку Уладзіміра Карагіна, згаданая платформа з'яўляецца найважнейшым элементам сістэмных антыкрызісных захадаў, што робяцца ў рэспубліцы.

— Сусветны крызіс, безумоўна, закрануў нашу краіну, усе рынкі і ўсю сферу гаспадарча-эканамічных адносінаў, — каментуе ён сённяшнія рэаліі. — Аднак у тым выпадку, калі марудзіць час яшчэ на працягу 2-3 месяцаў і не рабіць ужо зараз першачарговых захадаў па мінімізацыі наступстваў крызісу, рэспубліку можа спасцігнуць шмат іншых негатыўных фактараў. Таму што многія негатыўныя з'явы да нас прыходзяць крыху пазней, чым на прастору вакол Беларусі.

— У такім разе, на ваш погляд, якія змены неабходна прымаць тэрмінова, каб пазбегнуць найгоршага сцэнарыя развіцця падзей?

— У першую чаргу, зняць усе перашкоды, якія звязваюць па руках і нагах непасрэдна бізнэс. Яму сёння неабходна быць у найбольшай ступені мабільным і актыўным. Гэта значыць, трэба рэалізоўваць у краіне захады, якія будуць накіраваныя на разняволенне магчымасцяў айчыннага бізнэсу, забеспячэнне яго большай свабодай дзейнняў. Гэта, у сваю чаргу, будзе спрыяць стварэнню больш прымальных умоў для прыцягвання ў рэспубліку інвестараў. Інвестары прыйдуць на больш свабоднае поле дзейнасці праз узаемадзеянне з бізнэсам. Між іншым, самі па сабе яны будуць вельмі доўга адаптавацца. Інвестар адаптуецца 3-5 гадоў, а потым часта сыходзіць, калі прыходзіць у краіну самастойна, без партнёра з беларускага боку.

— Уладзімір Мікалаевіч, гаворачы пра захады па разняволенні магчымасцяў айчыннага бізнэсу, што канкрэтна маецца на ўвазе?

— У прыватнасці, зараз многія прадпрымальнікі чакаюць адмены дзяржаўнага рэгулявання цэнаў, што дасць прыватным прадпрыемствам, ды і прадпрыемствам з доляй дзяржавы, большую гнуткасць.

— Аднак многіх палохае тое, што падобны крок можа выліцца ў «анархію» цэнаў.

— Ніхто гэтыя цэны павышаць не будзе, таму што тут сваё слова скажа рынак. Але гэта, паўтаруся, надасць гнуткасць бізнэсу, і прадпрымальнікі змогуць больш хутка рэагаваць на змены як на ўнутраных рынках краіны, так і на знешніх. Для многіх прадпрыемстваў адсутнасць магчымасці манеўраваць на рынку праз цэны з'яўляецца пытаннем іх выжыўдольнасці. Зараз вельмі шмат энергіі адбіраюць розныя абгрунтаванні і цяганіна. Да прыкладу, учора адбылося хістанне цэнаў па якойсьці групе тавараў, скажам па металапрадукцыі, і трэба хуценька на гэтыя змены пераарыентавацца, штосьці прапанаваць на працягу 3-5 дзён і выйсці на рынак той жа Расіі, Украіны ці Літвы. Аднак мы гэтага зрабіць не можам, таму што стрымлівае рэгуляванне.

Вельмі важна як мага хутчэй спрасціць дакументазварот, і надзвычай важнае пытанне — супрацьдзеянне манапалістычным практыкам. Мы звяртаемся да ўладаў, да Прэзідэнта з прапановай аб неабходнасці тэрміновага стварэння антыманапольнага органа. Яго фарміраванне закліканае, па-першае, ажыццяўляць антыманапольнае рэгуляванне, а па-другое, ва ўмовах крызісу вельмі важна праводзіць даследаванне наконт таго, як вядуць сябе на рынках манапалісты. Паводле нашага меркавання, неабходны больш жорсткі механізм антыманапольнага рэгулявання. Патрэбны магутны, уплывовы орган, такі, які быў у нас гадоў 12 таму. Зазначу, што магутная антыманапольная служба ёсць у Расіі, ва ўсіх краінах Еўропы таксама працуюць адпаведныя органы, якія аналізуюць у большай ступені паводзіны суб'ектаў гаспадарання на рынках і забяспечваюць сумленныя правілы гульні. У нас жа з аднаго боку прысутнічае высокая зарэгуляванасць гаспадарчай дзейнасці, з другога — поўная бескантрольнасць з пункту гледжання манапалістычных праяў. Пры тым малы і сярэдні бізнэс, ды і дзяржаўныя прадпрыемствы пастаянна адчуваюць праблемы і складанасці з-за непрагназуемых дзеянняў манапалістаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ХТО ЗЛОДЗЕЙ?

У выніку праверкі выяўлена, што ў краме в. Вялікая Сваротна не ўсё чыста. Знікла матэрыяльных каштоўнасцяў больш чым на дзевяць з паловай мільёнаў. Падазрэнне легла на загадчыка крамы, і пракуратура Баранавіцкага раёна завяла крымінальную справу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»
ОБЪЯВЛЯЕТ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ЗА 2008 ГОД.
Срок выплаты дивидендов — с 24.03.2009 г. до 23.05.2009 года. Размер дивидендов на 1 акцию: 2,01 рубля (1,44 % к номинальной стоимости). Порядок выплаты дивидендов: дивиденды будут перечисляться следующим образом:
— юридическим лицам — на расчетные счета в банках;
— физическим лицам — почтовыми переводами по месту жительства.
УНП 200037600.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение (вспомогательное здание столовой) и право заключения договора аренды земельного участка	Капитальные строения (производственное здание и здание сарая) и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Ивацевичский р-н, 2,2 км юго-западнее д. Холопья	Брестская область, Ивановский район, Снитовский с/с, д. Снитово
Продавец недвижимого имущества	Министерство энергетики РБ (в лице ОАО «Белтрансгаз») тел. 8017 219 14 37, 801562 7 23 53	РУПАД «Бреставтодор» тел. 80162 20 31 09
Сведения о предмете аукциона	Здание 1985 г.п., 1-этажн., площадь – 143 кв.м. Земельный участок площадью 0,0628 га, срок аренды – 50 лет	Капитальное строение (производственное здание) 1-этажное 1979 г.п., кирпичное, общая площадь – 47,5 кв.м, в состав кап. строения входит также пристройка. Капитальное строение (сарай) 1-этажное 1991 г.п., кирпичное, общая площадь – 36,3 кв.м. Земельный участок площадью 1,6538 га, срок аренды – 90 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	39 999 293	23 140 096
Сумма задатка, руб.	3 999 000	2 314 000
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63 www. brest–region.by*	

Аукцион состоится **30 апреля 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538.

3. Юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица.

4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и расходы на подготовку и проведение аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 29 апреля 2009 года включительно.

Абзац

■ Завяршылася ацэнка кантрабанднага грузу, які пінскія памежнікі затрымалі 22 сакавіка каля населенага пункта Лелікава, у трох кіламетрах ад дзяржаўнай мяжы. На павозках зламыснікі, якія збеглі пры затрыманні, везлі з Украіны цяляціну і швейную фурнітуру. Акрамя таго, у ходзе вышуковых мерапрыемстваў у Кобрынскім раёне ў кіламетры ад мяжы было выяўлена месца складзіравання тушаў цяляціны і фурнітуры для шыцця. Усяго было адабрана больш за 40 тушаў цялят агульным коштам у Br24 млн і 40 скрынак фурнітуры, якая пацягнула на Br522 млн. Кошт абедзвюх павозак, кінутых зламыснікамі — Br800 тыс.

■ **Швейцарскія банкі забаранілі сваім кіраўнікам выязджаць нават у суседнія краіны — Францыю і Германію — апасаючыся арыштаў на хвалі скандалу, які разгараецца вакол захавання банкаўскай тайны. Сутнасць у тым, што ў сярэдзіне 2008 года падкамітэт па расследаваннях сената ЗША апублікаваў даклад, у якім сцвярджалася, што еўрапейскія банкі дапамагалі багатым амерыканцам хавацца ад падаткаў. Амерыканскім грамадзянам нібыта ўдалося такім чынам схаваць ад падаткаабкладання $1,5 трлн і недаплаціць у казну каля $100 млрд. Швейцарскія банкіры сваю віну ў гэтым прызналі і былі вымушаныя згарнуць афшорныя паслугі.**

Поўны абзац

■ Жыхар Піткяранцкага раёна Карэліі заплаціў сваёй 7-гадовай дачцэ 2 тысячы рублёў у якасці кампенсацыі маральнай шкоды пасля таго, як выцяў яе папругай. Мужчына адлупцаваў дзіця ў лістападзе 2008 года; потым супраць яго была ўзбуджана крымінальная справа, якую пазней спынілі за прымірэннем бакоў.

■ **Сыо Тэры і Сыо Пуп, маці і цешча англійскага футбаліста «Чэлсі» Джона Тэры, былі затрыманыя за крадзеж адзення і прадуктаў харчавання на агульную суму ў 800 фунтаў стэрлінгаў. Скрадзеныя тавары былі знойдзены ў машыне жанчын, калі тыя накіроўваліся ў гандлёвы цэнтр па новую здабычу. Калі іх затрымалі, жанчыны не змаглі зразумела патлумачыць свае паводзіны. Відавочна, на крадзяжы іх штурхала не беднасць — Джон Тэры штотыднёва атрымлівае ў «Чэлсі» 135 тысяч фунтаў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ТЭРАКТ У ПАКІСТАНЕ

Тэрарыст-самазабойца ў пятніцу падарваў бомбу падчас набажэнства ў мячэці ў раёне Джамруд на паўночным захадзе краіны непадалёк ад афганскай мяжы. У выніку прынамсі 51 чалавек быў забіты, яшчэ ад 80 да 90 атрымалі раненні рознай ступені складанасці.

Колькасць загінулых, па ўсёй верагоднасці, будзе павялічвацца, паколькі на набажэнстве прысутнічала вельмі многа людзей — паводле папярэдніх ацэнак — каля 250 чалавек. Пакуль з-пад завалаў даталі 51 цела.

У РФ ЗАСНАВАНЫ ДЗЕНЬ ПАРТЫЗАНАЎ І ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ

Дзярждума прыняла ў трэцім канчатковым чытанні закон, які абвяшчае ў якасці памятнай даты Дзень партызанаў і падпольшчыкаў. Ён будзе адзначацца 29 чэрвеня пачынаючы з 2010 года.

Паведамляецца, што парламентарыі зацвердзілі гэтую памятную дату «ў знак памяці самаадданай барацьбы ў тыле ворага партызанаў і падпольшчыкаў, якія ўнеслі значны ўклад у перамогу савецкага народа над фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гадоў».

УЖЫВАННЕ ГАРАЧАЙ ГАРБАТЫ СУР'ЁЗНА ПАВЯЛІЧВАЕ РЫЗЫКУ ЎЗНІКНЕННЯ РАКУ СТРАВАВОДА

Ужыванне чорнай гарбаты, тэмпература якой не ніжэйшая за 70 градусаў, значна павышае рызыку ўзнікнення раку стрававода, высветлілі іранскія вучоныя.

Сярод еўрапейцаў і амерыканцаў галоўнымі прычынамі ўзнікнення гэтай хваробы лічацца курэнне і ўжыванне алкаголю. Пры гэтым адзін з самых высокіх узроўняў захворвання ракам стрававода зафіксаваны ў паўночнай іранскай правінцыі Галестан. Жыхары гэтай правінцыі мала паляць і амаль не ўжываюць алкаголю, але гарбату п'юць у велізарных колькасцях. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што ў параўнанні з ужываннем цёплай гарбаты (да 65 градусаў) ужыванне гарачай гарбаты (65-69 градусаў) вядзе да двухразовага павелічэння рызыкі ўзнікнення раку стрававода. А ўжыванне вельмі гарачай гарбаты (ад 70 градусаў), сцвярджаюць аднмыслоўцы, павялічвае гэтую рызыку ў восем разоў. Пры гэтым сувязь паміж колькасцю спажываной гарбаты і рызыкай узнікнення раку вызначана не была.

г. ВИТЕБСК 29.04.2009 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже объектов государственной собственности с одновременной продажей права заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
2.	Капитальное строение с инв. № 201/С-8433 (здание пожарного депо на один выезд), расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, Вайханский с/с, д. Большие Стайки, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, общая площадь 195,1 кв.м, объем 1127 куб.м, 1993 г. постройки, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная, полы бетонные, электроосвещение – скрытая проводка. Земельный участок с кадастровым номером 221882201801000080, площадью 0,4222 га для содержания и обслуживания объекта недвижимости, сроком аренды 99 лет	142 166 581	14 216 658
3.	Капитальное строение – здание административное (инв. № 200/С-51180), расположенное по адресу: г. Витебск, Бешенковическое шоссе, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: двухэтажное кирпичное здание, общая площадь 305 кв.м, объем 1303 куб.м, 1982 г. постройки, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная. Забор (металлический) – 42,2 м. Покрытие (асфальтобетонное) – 138,17 кв.м. Цементобетонные откосы – 72,6 кв.м. Деревья: тополь, береза 2 шт., липа. Земельный участок с кадастровым номером 240100000003000685, площадью 0,0768 га для содержания и обслуживания находящегося в государственной собственности имущества, сроком аренды 99 лет. Ограничение: зона санитарной охраны полезных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения 0,0048 га	135 970 159	13 597 015

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 47-60-96, сайт **www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: Лот № 2 – Учреждение «Витебское областное управление Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь», контактные телефоны: (0212) 47-64-09, 47-40-95;

Лот № 3 – Республиканское унитарное предприятие автомобильных дорог «Витебскавтодор», контактные телефоны: (0212) 36-56-57.

АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА: по Лоту № 2 – Городокский райисполком; по Лоту № 3 – Витебский горисполком.

Условия пользования земельными участками:

Лот № 2:

- заключение победителем аукциона с Городокским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на реконструкцию объекта в срок, не превышающий 2 года;

Лот № 3:

- заключение победителем аукциона с Витебским горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения Витебским горисполкомом о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- введение в эксплуатацию объекта не позднее двух лет со дня заключения договора аренды земельного участка;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Витебского горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год;

- осуществление строительства объекта в сроки определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится 29 апреля 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, заверенные нотариально; индивидуальными

Незалежная экспертыза Леаніда Заікі

ФІНАНСАВЫ СВЕТ У ЧАКАННІ ПЕРАМЕН

Зусім мала часу засталося да адкрыцця 2 красавіка ў Лондане антыкрызіснага саміту так званай Вялікай дваццаткі (G20). Напярэдадні гэтай сустрэчы наш карэспандэнт узяў інтэрв'ю ў вядомага беларускага эканаміста, кіраўніка аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Л.Ф. ЗАІКІ.

— Не пакідае ўражанне, што лідары самых развітых і ўплывовых краін планеты ва ўмовах паглыблення і пашырэння глабальнага крызісу чамусьці дзейнічаюць марудна. Я б нават сказаў запаволена і, мякка кажучы, не зусім адэкватна. У выніку прапусцілі момант узяць сітуацыю пад кантроль яшчэ на першым этапе развіцця фінансавага крызісу. Выходзіць, «праспалі» крызіс лідары?

— Гэта вам здалося. Цяпер кіраўнікі вядучых эканомік пазбягаюць рэзкіх рухаў і дзеянняў у сусветнай фінансавай сістэме і эканоміцы, каб не справакаваць паўнамаштабны разбуральны крызіс накшталт сумнавядомай Вялікай дэпрэсіі 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Рэгулярна сустракаюцца міністры фінансаў Еўрасаюза, ЗША, Японіі, іншых развітых краін, каардынуюць свае рашэнні. Не, працэс ідзе.

Саміт Вялікай дваццаткі — гэта значнае і адказнае мерапрыемства, да яго трэба старанна рыхтавацца. Ну сабраліся б яе лідары раней, скажам, у лютым. Ну і што? У макраэканоміцы адзінкай вымярэння для аналізу стану спраў прынята лічыць квартал. Таму перад самітам у Лондане ўжо будуць на 90% гатовыя звесткі пра першыя тры месяцы работы сусветнай эканомікі. Тут трэба мець на ўвазе, што крызісы накшталт цяперашняга адбываюцца прыкладна раз у 80 гадоў. Ведаеце, кіраўнікам вядучых дзяржаў планеты не да твару мітусіцца і спяшацца з тэрмінамі саміту.

— Леанід Фёдаравіч, ці можна сёння больш-менш дакладна прагназаваць вынікі пасяджэння Вялікай дваццаткі?

— А ці трэба? Давайце не будзем забягаць наперад. Чакаць засталося зусім мала. Хаця можна, у прыватнасці, адзначыць, што адно з цэнтральных месцаў у ходзе дыскусій, якія маюць адбыцца ў Лондане, зойме выпрацоўка мераў па супрацьдзеянні росту пратэкцыянізму з боку асобных краін. Бо ўжо сёння відавочна, што глабальны рынак пачаў паступова распадацца на некалькі рэгіянальных рынкаў. Ужо і Беларусь уключылася ў гэты працэс па стварэнні рынку сумесна з Расіяй, Украінай і Казахстанам.

— Якая задача ўсё ж самая складаная для стабілізацыі сусветнай эканомікі?

— Думаю, асноўная праблема і ў грошах, і ў іх замяняльніках. Бо крызіс узнік далёка невыпадкова. Апошнія гады ў свеце ішоў (і тым больш ідзе цяпер) актыўны пошук простых і даступных ліквідаў. Гэта ўсё тое, што з'яўляецца сродкам абмену і плацяжу: грошы, розныя каштоўныя паперы, акцыі, аблігацыі і да т.п. І іх знайшлі. Думаеце, імі сталі нейкія новыя фінансавыя інструменты тыпу новых відаў аблігацый ці інвестыцыйных укладанняў? Не, грошы пачалі замяняць рэальнымі каштоўнасцямі, што ў значнай ступені стала важным адлюстраваннем увогуле нашай рэчаіснасці і асаблівасцяў фарміравання новай грашовай і таварнай прасторы глабальнага рынку.

Замена долару, еўра ці расійскаму рублю знайшлася ў форме нерухомасці. І не толькі недзе там, «за бугром», за морам-акіянам, але і ў нас: у Гомелі, Смаргоні, Чэрыкаве, асабліва ў Мінску. Вядома, рынак нерухомасці існаваў заўсёды. Але характэрнай прыкметай апошніх гадоў стала тое, што гэты рынак ператварыўся, а дакладней, набыў такую функцыю грошай, як іх зберажэнне. Прычым, зберажэнняў эфектыўных, са станоўчай дынамікай росту. Рост цэнаў на жыллё ў многім садзейнічаў стварэнню ў ЗША вялізарнай і небяспечнай фінансавай мыльнай бурбалкі, якая лопнула ў сярэдзіне 2008 года. Таму выйсце з крызісу ўсё адно будзе суправаджацца і адбывацца ў выглядзе «зачысткі» рынку нерухомасці і тых фінансавых гульцоў, якія ў пагоні за звышдаходамі рызыкоўна загуляліся з інвестыцыямі ў іпатэку і будаўніцтва.

— А нафта — ліквід? Ці звязаны цэны на яе з курсам валют і як цана барэля ўплывае на эканоміку Беларусі? Паставім пытанне рубам: ці выгадныя нам высокія цэны на нафту?

— Краіны-нафтаздабытчыкі лічаць, што для іх падыходзіць цана $70-100 за барэль. Таму яны ўсяляк імкнуцца узняць цяперашнюю нізкую, на іх погляд, цану на сырую нафту. У Беларусі высокія цэны на нафту выгадныя ў першую чаргу некалькім фірмам і канторам, якія гандлююць нафтапрадуктамі. А для простых грамадзян лепш, калі нафта на сусветным рынку недарагая. Што датычыць сувязі паміж курсам валют і цаной барэля нафты, то тут прамой залежнасці няма. Хаця нафтапрадукты яшчэ доўга будуць адным з галоўных артыкулаў нашага экспарту. Я не чуў, каб Індыя і Кітай збіраліся істотна знiжаць тэмпы росту вытворчасці і спажывецкага попыту. Яны няўхільна рухаюцца ў кірунку да сусветнага эканамічнага лідарства, ім будзе патрэбна ўсё больш энерганосьбітаў і нафтапрадуктаў. А колькі паліва будуць спажываць іншыя краіны, якія актыўна развіваюцца, ужо ў недалёкай будучыні!

— А ці не здаецца вам, што свет стаміўся ад дамінiравання амерыканскага долара? І ўжо то тут, то там чуваць прапановы аб стварэнні новай паралельнай ці рэзервовай валюты. Нядаўна з падобнымі прапановамі выступілі Расія і Кітай. Дарэчы, такую ідэю агучыў прэзідэнт Казахстана Нарсултан Назарбаеў. Відаць, пытанне наспела?

— Можна ўсяляк крытыкаваць і ганьбіць долар, доўга шукаць яму эфектыўную замену... і нічога не знайсці. Зараз сітуацыя такая, што па-сапраўднаму долар можа замяніць толькі золата, а разлікі можна весці з дапамогай электронных грошай. Усе іншыя спробы замены, на мой погляд, не будуць мець поспеху. А вось увядзенне залатога стандарту прынясе плён, бо долар — гэта папяровыя грошы, золатам ён не забяспечаны. Увогуле замену долара, як мне бачыцца, лепш пачынаць з увядзення надзейных рэгіянальных валют. У Маскве, як вы ведаеце, у пачатку года аб'явілі аб намеры зрабіць такой валютай расійскі рубель, карыстацца ім дала згоду Беларусь. Праўда, рэалізацыя гэтага намеру зойме не адзін год, задача для выканання працаёмкая і вельмі няпростая.

Пабачым, можа саміт Вялікай дваццаткі прапануе свой варты ўвагі варыянт замены долара. Хаця ў агляднай будучыні, на мой погляд, катастрофа гэтаму амерыканцу не пагражае. У найбліжэйшы час можа здарыцца наступнае: як толькі прэзідэнт ЗША Барак Абама пачне актыўна напампоўваць сваю эканоміку сотнямі мільярдаў бюджэтных долараў, курс амерыканскай валюты пачне знiжацца, сітуацыя з курсамі валют стабілізуецца. У свеце знікне вялікі попыт на долары. Дарэчы, ужо ў некаторых краінах, напрыклад, Расіі, гэты працэс пачаўся.

— Вакол амерыканскага долара сёння ў нас толькі чутак і самых неверагодных прагнозаў: ад небывалага ў недалёкай будучыні ўзлёту да канчатковай страты пазіцыі сусветнага фінансавага лідара. Нядаўна пачуў «навіну» аб тым, што ў нетрах Урада рыхтуецца новая «пастка» для жыхароў Беларусі: чарговая дэвальвацыя рубля на 30 %. Як вам здаецца, ці рэальна гэта і што будзе з курсам «зялёнай» валюты ў нашай краіне?

— Ва Урадзе ёсць сілы, якія адказваюць за пэўныя сегменты нашай эканомікі і лабіруюць інтарэсы «сваіх» галін і прадпрыемстваў-гігантаў. Для нашых вытворцаў экспартнай прадукцыі выгадны рост курсу долара ў Беларусі. Бо на сусветным рынку іх, як і іншых краін, вырабы і тавары патаннелі, там увогуле складана стала гандляваць. Адсюль, магчыма, і тайная надзея на дэвальвацыю. А вось насельніцтву далейшае падзенне рубля будзе вельмі цяжка перажыць. Але я не думаю, што хутка адбудзецца яшчэ адна рэзкая дэвальвацыя рубля.

— Апошнім часам Нацыянальны банк выступіў з ініцыятывай стварэння ў краіне так званых калектарскіх агенцтваў — арганізацый, якія займаюцца вяртаннем ці, прасцей кажучы, «выбіваннем» праблемных банкаўскіх крэдытаў і запазычанасцяў. Гэта крок у правільным кірунку?

— Так. Даўно трэба было ўзаконіць калектарскую дзейнасць у Беларусі, ужо час усім нам навучыцца жыць па сродках і вяртаць даўгі. Мы неяк хутка забылі, што тузін гадоў таму заработкі штомесяц у сярэднім 25-30 долараў. А цяпер ужо 300 долараў далёка не для кожнага прымальная зарплата. Безумоўна, грошы робяць наша жыццё больш камфортным і прыемным. Але адначасова грошы і своеасаблівы прысуд для тых, хто занадта легкадумна глядзеў у сваю фінансавую будучыню. Зараз многія беларусы на ўласным вопыце пераканаліся, што жыццё ў рынкавых умовах гэта не толькі задавальненне ў выглядзе знакамітых «чаркі і скваркі», але і сур'ёзнае выпрабаванне. Усе банкі ды і многія эканамісты пераконвалі і працягваюць пераконваць насельніцтва, што пазычаць грошы заўсёды добра. І амаль нічога не гавораць пра тое, што іх трэба вяртаць з немалымі працэнтамі. Пра іх не надта задумваліся і многія крэдытаатрымальнікі.

> **"Не думаю, што хутка адбудзецца яшчэ адна рэзкая дэвальвацыя рубля. Як толькі ЗША пачнуць напампоўваць сваю эканоміку сотнямі мільярдаў бюджэтных долараў, курс амерыканскай валюты ў нас пачне "**

— Паўсюдна толькі і чуваць: крызіс ідзе! А ці ёсць у замежжы адэкватныя гэтай навале эфектыўныя захады супрацьдзеяння?

— Днямі Індыя з больш чым мільярдным насельніцтвам абвясціла аб пачатку серыйнага выпуску самых танных у свеце легкавых аўтамабіляў. Уяўляеце, колькі гэтых народных машын хутка будзе «бегаць» па дарогах гэтай і іншых краін? Індыйцы — малайцы! Яны дзейнічаюць ва ўмовах глабальнага крызісу найлепшым чынам. Што такое барацьба з яго наступствамі? Гэта эканомія па ўсіх кірунках, скідванне залішняй вагі ў эканамічным сэнсе, адмова ад непатрэбнай і нерэнтабельнай вытворчасці, ад выпуску прадукцыі для вельмі абмежаванага кола спажыўцоў.

Індыйцы ўсяму свету нагадалі, што аўтамабіль — гэта ў першую чаргу сродак руху, а ўжо потым прадмет прэстыжу. Іх машына, калі не памыляюся, называецца Тата-Нана, каштуе ад 1,5 да 2,5 тысяч долараў і па кішэні вельмі многім у Індыі і далёка за яе межамі. Папулярнасць гэтаму аўтамабілю гарантавана. Таму нам варта было б абдумаць магчымасць выпуску ў Беларусі Тата-Наны ў еўрапейскім варыянце. Наша насельніцтва траціць больш за мільярд долараў на набыццё патрыманых замежных аўто.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

Ул. Мясникова, 32, 220050, г. Минск.
Тел.: (017) 200 18 31. Факс: (017) 226 47 50.
Телекс: 252408 PION BY, 252608 SBBEL BY
E-mail: info@belarusbank.by
Интернет: http://www.belarusbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 января 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	569261,6	401312,4
3	Средства в Национальном банке	1102	2	2069725,0	731087,9
4	Ценные бумаги:	1103		1642223,5	1193840,5
	для торговли	11031	3	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	7,1	7,3
	в наличии для продажи	11033	3.2	1642216,4	1193833,2
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	2061163,1	590668,8
6	Кредиты клиентам	1106	5	19234468,0	13363332,7
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	175194,3	134274,1
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	644899,8	515154,0
9	Прочие активы	1109	8	197057,9	106833,9
10	ИТОГО активы	110		26593993,2	17036504,3
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	1761930,1	905570,7
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	2315751,6	1387668,2
14	Средства клиентов	1206	11	18676529,9	12046722,6
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		363387,1	208834,6
16	Прочие обязательства	1209	12	249543,8	185232,5
17	ВСЕГО обязательства	120		23367142,5	14734028,6
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	2287546,0	1637530,9
20	Эмиссионный доход	1212		—	—
21	Резервный фонд	1213		109007,2	52773,1
22	Накопленная прибыль	1214	14	518369,9	378726,7
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	311927,6	233445,0
24	ВСЕГО капитал	121		3226850,7	2302475,7
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		26593993,2	17036504,3
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	44963228,4	32648847,2
28	Обязательства	1302	17	3952890,7	2874040,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
за 2008 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1848160,4	1336589,3
2	Процентные расходы	2012		1302072,6	872739,8
3	Чистые процентные доходы	201	18	546087,8	463849,5
4	Комиссионные доходы	2021		433611,1	336968,7
5	Комиссионные расходы	2022		61413,4	53745,7
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	372197,7	283223,0
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	214940,8	113963,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	5695,1	1535,9
9	Доход в форме дивидендов	205		577,7	509,9
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	78077,4	(-5099,2)
11	Прочие доходы	207	23	87164,0	43014,6
12	Операционные расходы	208	24	777901,7	624162,4
13	Прочие расходы	209	25	101765,4	42738,1
14	Налог на прибыль	210		61022,7	55787,3
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		207895,9	188507,5
	Базовая прибыль на простую акцию (бел. руб.)			122,89	129,62
	Разводненная прибыль на простую акцию (бел. руб.)			—	—

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА
за 2008 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статей капитала / Наименование показателей	Символ	Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль (убыток)	Фонды переоценки статей баланса	Всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	**Раздел I. За год, предшествующий отчетному**							
2	Остаток на 1 января 2007 г.	3011	1437530,9	—	32799,5	219078,8	191981,0	1881390,2
3	Изменения статей капитала	3012	200000,0	—	19973,6	159647,9	41464,0	421085,5
	В том числе:							
3.1	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	x	x	x	188507,5	x	188507,5
3.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	—	x	19973,6	(-19973,6)	x	—
3.3	операции с учредителями (участниками):	30123	200000,0	—	x	(-28,2)	x	199971,8
3.3.1	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	200000,0	—	x	x	x	200000,0
3.3.2	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(-28,2)	x	(-28,2)
3.3.3	операции с собственными выкупленными акциями	301233	—	x	x	x	x	—
3.4	проведение переоценки статей баланса	30124	x	x	x	x	41464,0	41464,0
3.5	перераспределение между статьями капитала	30125	—	—	—	—	—	—
3.6	прочие изменения	30126	—	—	—	(-8857,8)	—	(-8857,8)
4	Остаток на 1 января 2008 г.	3013	1637530,9	—	52773,1	378726,7	233445,0	2302475,7
5	**Раздел II. За отчетный год**							
6	Остаток на 1 января 2008 г.	3011	1637530,9	—	52773,1	378726,7	233445,0	2302475,7
7	Изменения статей капитала	3012	650015,1	—	56234,1	139643,2	78482,6	924375,0
	В том числе:							
7.1	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	x	x	x	207895,9	x	207895,9
7.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	—	x	56234,1	(-56234,1)	x	—
7.3	операции с учредителями (участниками):	30123	650015,1	—	x	(-12011,0)	x	638004,1
7.3.1	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	650000,0	—	x	x	x	650000,0
7.3.2	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(-12011,0)	x	(-12011,0)
7.3.3	операции с собственными выкупленными акциями	301233	15,1	x	x	x	x	15,1
7.4	проведение переоценки статей баланса	30124	x	x	x	x	78482,6	78482,6
7.5	перераспределение между статьями капитала	30125	—	—	—	—	—	—
7.6	прочие изменения	30126	—	—	—	(-7,6)	—	(-7,6)
8	Остаток на 1 января 2009 г.	3013	2287546,0	—	109007,2	518369,9	311927,6	3226850,7

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ
за 2008 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	**Потоки денежных средств от операционной деятельности**				
2	Полученные процентные доходы	7010		1847534,9	1334659,8
3	Уплаченные процентные расходы	7011		-1273892,0	-852649,5
4	Полученные комиссионные доходы	7012		433622,5	336975,1
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		-60654,4	-51873,3
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		202540,1	126482,7
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		5695,1	1535,9
8	Доход в форме дивидендов	7016		577,5	509,8
9	Прочие полученные доходы	7017		43183,5	33962,8
10	Прочие уплаченные расходы	7018		-752282,4	-611575,8
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		-61012,9	-55945,0
12	Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах	701		385311,9	262082,5
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		35099,6	80955,0
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	7021		-439207,7	-146019,5
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках	7022		-380392,9	-285312,6
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	7023		-5970248,2	-3516595,3
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		-1929662,1	-30931,9
18	Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов	702		-8684411,3	-3897904,3
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030		852632,6	116876,1
20	Чистый прирост (снижение) денежных средств в форме кредитов и других средств банков	7032		-139920,1	232591,3
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		6540216,3	3286906,3
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		149606,4	120363,0
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		1240645,8	-190376,8
24	Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств	703		8643181,0	3566359,9
25	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		344081,6	-69461,9
26	**Потоки денежных средств от инвестиционной деятельности**				
27	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	7110		-108323,7	-105273,2
28	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	7111		8229,2	8051,5
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7112		-40920,0	-59436,8
30	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7113		3085,6	559,5
31	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7114		—	-0,3
32	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7115		2,1	101431,6
33	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		-137926,8	-54667,7
34	**Потоки денежных средств от финансовой деятельности**				
35	Эмиссия акций	7211		650000,0	200000,0
36	Выкуп собственных акций	7212		—	—
37	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213		15,1	—
38	Выплата дивидендов	7214		-12009,7	-27,1
39	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		638005,4	199972,9
40	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73		-51035,6	10731,2
41	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		793124,6	86574,5
42	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740	1	X	804084,8
43	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741		1597209,4	X

Председатель Правления **Н. А. Ермакова**

Главный бухгалтер **И. П. Лысоковская**

«03» марта 2009 г.

Достоверность отчета подтверждена во всех существенных аспектах

Директор АООО «Аудитэл» **А. И. Папковский**

Аудиторское общество с ограниченной ответственностью

220012, г. Минск
пер. Калининградский, 16
тел./факс 280 35 39
e-mail: auditel@mail.ru

АУДИТЭЛ

р/с 3012007218011
в «Приорбанк» ОАО
ЦБУ 100 г. Минск, код 749
УНП 100591487

Исх. 33
19 марта 2009 г.

Председателю Правления
Открытого акционерного общества
«Сберегательный банк «Беларусбанк»
Н.А. Ермаковой

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
по годовому отчету за 2008 год

Аудируемое лицо:
Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»;
сокращенное наименование — ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»);
местонахождение: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32;
сведения о государственной регистрации: зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 27.10.1995 за № 56;
УНП 100325912;

Аудиторская организация:
Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл»;
место нахождения — 220012, г. Минск, Калининградский пер., 16;
свидетельство о государственной регистрации в качестве аудиторской организации № 100591487 от 28 сентября 2000 г., выданное Минским городским исполнительным комитетом;
УНП — 100591487
специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности 02200/0061001 от 03 февраля 2004 г., выданное Министерством финансов Республики Беларусь на срок по 02 февраля 2009 г.; лицензия продлена до 02 февраля 2014 г. за номером 02200/0495343 от 02 февраля 2009 г.
лицензия на осуществление аудиторской деятельности в банковской системе № 2 от 17 ноября 2004 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь на срок 5 лет со дня выдачи.

Мы провели аудит прилагаемого годового отчета ОАО «АСБ Беларусбанк», состоящего из бухгалтерского баланса на 01.01.2009, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств за 2008 г., примечаний, включая краткое описание существенных элементов учетной политики и прочие пояснения.

Руководство ОАО «АСБ Беларусбанк» несет ответственность за подготовку и представление годового отчета в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверного годового отчета, не содержащего существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данного годового отчета и соответствии совершенных ОАО «АСБ Беларусбанк» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия или отсутствия существенных искажений в представленном годовом отчете.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в годовом отчете. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годового отчета в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годового отчета нами рассматривалась система внутреннего контроля ОАО «АСБ Беларусбанк» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а также с целью выражения мнения относительно организации этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления годового отчета.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, годовой отчет ОАО «АСБ Беларусбанк», сформированный в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «АСБ Беларусбанк» на 1 января 2009 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 г. При этом совершенные ОАО «АСБ Беларусбанк» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству. Действующая в ОАО «АСБ Беларусбанк» система внутреннего контроля соответствует характеру, масштабам и условиям деятельности банка, нормативы безопасного функционирования, установленные Национальным банком Республики Беларусь, на 1 января 2009 г. выполнены.

Директор АООО «Аудитэл» **А.И. Папковский**

Аудитор, возглавлявший аудит **С.С. Ткачук**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Краіна здароўя

Выпуск № 11 (125)

Другая перасадка сэрца

У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Кардыялогія» праведзена другая аперацыя па перасадцы сэрца.

Як паведамілі ў цэнтры, донарскі орган, перасаджаны 55-гадоваму мужчыну з дыягназам дылатацыйная кардыяміпатыя, быў дастаўлены з Брэста. Аперацыю выканала на чале з прафесарам Юрыем Астроўскім тая ж брыгада высокакласных кардыяхірургаў і анестэзіёлагаў, што выконвала і першую. Стан пацыента адпавядае цяжкасці перанесенай аперацыі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Па чутках і аўтарытэтна

ХВАРЭЦЬ — НЯВЫГАДНА. ВЫГАДНА — НЕ ХВАРЭЦЬ!

З 1 красавіка 2009 года пацыенты дзённых стацыянараў будуць аплачваць лекі за ўласныя сродкі — такая інфармацыя з'явілася днямі ў інтэрнэце. Каб высветліць, наколькі яна адпавядае рэчаіснасці, мы звярнуліся па каментарый да намесніка начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, начальніка аддзела першаснай медыка-санітарнай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людмілы ЖЫЛЕВІЧ:

— Сапраўды, Міністэрствам аховы здароўя падрыхтаваны ліст, у якім мы тлумачым, як згодна з заканадаўствам вызначаецца парадак лекавага забеспячэння пацыентаў у аддзяленнях дзённага знаходжання.

Трэба мець на ўвазе, што ў студзені гэтага года ўступіў у сілу новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя». Згодна з артыкулам 38 закона, грамадзяне Рэспублікі Беларусь пры аказанні ім медыцынскай дапамогі ў стацыянарных умовах забяспечваюцца лекавымі сродкамі, вырабамі медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікай за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэтаў на падставе клінічных пратаколаў ці метадаў аказання медыцынскай дапамогі. Ва ўсіх іншых выпадках, не прадугледжаных заканадаўствам, грамадзяне Рэспублікі Беларусь забяспечваюцца лекамі за кошт уласных сродкаў, сродкаў юрыдычных асобаў і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам. Паколькі ў кіраўнікоў арганізацый аховы здароўя ўзнікалі пытанні наконт лекавага забеспячэння пацыентаў аддзяленняў дзённага знаходжання (хто ж павінен аплачваць лекі?), нам давялося растлумачыць, што калі аддзяленне дзённага знаходжання размешчана на базе амбулаторна-паліклінічнай арганізацыі, то лекавыя сродкі для ажыццяўлення лячэння павінны набывацца за кошт сродкаў саміх пацыентаў. А ўсе медыцынскія маніпуляцыі, ін'екцыі, сродкі рэабілітацыі, фізіятэрапеўтычныя сродкі і г.д. пацыенты атрымліваюць бясплатна.

— Людміла Аверкіеўна, на фоне росту цэнаў не толькі на імпартныя, але і на беларускія лекі рызыкну выказаць меркаванне, што для пэўнай часткі насельніцтва лячэнне ў аддзяленнях дзённага знаходжання можа стаць цяпер недаступным...

— Па-першае, лекавае забеспячэнне пэўнай часткі грамадзян ажыццяўляецца на льготных умовах. Напрыклад, інваліды I і II груп аплачваюць толькі 10 працэнтаў ад кошту лекаў, уключаных у Пералік асноўных лекавых сродкаў. Пры лячэнні ў аддзяленнях дзённага знаходжання гэта льгота таксама будзе захоўвацца. Да таго ж ёсць цэлы шэраг захворванняў, лячэнне якіх цалкам бярэ на сябе дзяржава: гэта анкалагічныя захворванні, цукровы дыябет і некаторыя іншыя. Тыя ж хворыя, якім іх матэрыяльнае становішча не дазваляе аплачваць лекі з уласнай кішэні, могуць звярнуцца па адрасную дапамогу ў сацыяльныя службы.

— Апошнім часам шмат гаворыцца пра неабходнасць скарачэння часу знаходжання пацыентаў у стацыянарах. Ці не атрымаецца так, што ад пацыентаў, якім гарантавана ў стацыянарах бясплатнае лекавае забеспячэнне, будуць проста пазбаўляцца, так бы мовіць, эканоміць на іх? Хто ўвогуле можа стаць пацыентам аддзялення дзённага знаходжання?

— У пастанове Міністэрства аховы здароўя ад 19 верасня 2008 года № 143 «Аб арганізацыі дзейнасці аддзялення дзённага знаходжання дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя» запісана, што аддзяленні дзённага знаходжання ствараюцца ў мэтах аказання медыцынскай дапамогі ў амбулаторных і (ці) стацыянарных умовах пацыентам, якія, як правіла, уваходзяць у групу рызыкі павышанай захваральнасці (у тым ліку і прафесійнай); працягла і часта хварэюць; маюць вострыя і хранічныя захворванні. Працягласць часу знаходжання пацыентаў у такім аддзяленні вызначаецца ўрачом з улікам прызначанага лячэння і ў залежнасці ад стану здароўя пацыента: пры аказанні медыцынскай дапамогі ў амбулаторных умовах — не больш як 4 гадзіны ў дзень, а пры аказанні медыцынскай дапамогі ў стацыянарных умовах — не больш як 6 гадзін у дзень. Пры неабходнасці час можа быць павялічаны. Рэжым работы аддзялення, парадак накіравання пацыентаў у аддзяленне і ўмовы іх выпіскі вызначаюцца кіраўніком арганізацыі аховы здароўя.

— А ці зможа пацыент, які цалкам аплачвае сваё лячэнне з уласнай кішэні, аддаць перавагу імпартнаму, а не беларускаму прэпарату, які, на яго думку, больш эфектыўны ці больш яму падыходзіць?

— Усе свае дзеянні пацыент павінен узгадняць з урачом. Любы прэпарат мае мноства аналагаў. Урач і сапраўды можа прызначыць пацыенту (з яго згоды) больш дарагі прэпарат, калі палічыць гэта апраўданым. Паколькі менавіта ўрач нясе адказнасць за вынікі лячэння, то ён можа прыслухоўвацца да меркавання пацыента, але канчатковае рашэнне застаецца за ім.

— А з якога часу пачне дзейнічаць новы парадак лекавага забеспячэння пацыентаў аддзяленняў дзённага знаходжання?

— Рэзкага пераходу ў адзін дзень і па ўсёй краіне не будзе. У многіх рэгіёнах яшчэ засталіся рэшткі лекаў, набытых у ранейшыя часы. А паколькі новыя сродкі на гэтыя мэты не выдзяляюцца, як толькі лекавыя запасы будуць вычарпаны, пацыентам давядзецца браць лекавае забеспячэнне на сябе. Але падкрэслю, што ўсе медыцынскія маніпуляцыі, растворы для ўнутрывенных ін'екцый, кропельніцы, шпрыцы, лекі для аказання неадкладнай дапамогі будуць для хворых бясплатныя...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЯК АТРЫМАЦЬ «ДОЎГАТЭРМІНОВЫ» РЭЦЭПТ?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«Звязда» яшчэ ў пачатку года паведамляла, што хранічныя хворыя змогуць атрымліваць лекі па доўгатэрміновых рэцэптах. Але чаму ўрачы аб гэтым не ведаюць? Ці не жадаюць гэта рабіць? Патлумачце, калі ласка, сітуацыю...

С.Ф, *Чэрвеньскі раён.*

— Са студзеня гэтага года ўрачы кіруюцца новай інструкцыяй аб парадку выпіскі рэцэпта ўрача, — паведаміла журналісту «Звязды» **намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, начальнік аддзела першаснай медыка-сацыяльнай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — Цяпер для амбулаторнага лячэння пацыентаў з хранічнымі захворваннямі (за выключэннем пацыентаў анкалагічнага профілю ў III—IV стадыі захворвання) лекавыя сродкі на льготных умовах ці бясплатна могуць быць выпісаны на курс лячэння тэрмінам да трох месяцаў. У гэтым выпадку ў медыцынскай картцы амбулаторнага хворага ўрачом робіцца арыфметычны разлік колькасці лекавага сродку (таблетак, капсул, ампул і г.д.), неабходных для ажыццяўлення лячэння на працягу месяца, і агульнай колькасці, неабходнай на курс лячэння тэрмінам да трох месяцаў. У выпадку неабходнасці выпіскі лекавага сродку на тры месяцы ўрачом у дзень агляду пацыента выпісваюцца адначасова тры рэцэпты, пры гэтым у кожным рэцэпце выпісваецца колькасць лекавага сродку для лячэння на адзін месяц.

На адваротным баку кожнага бланка рэцэпта робіцца запіс, з якой даты ён сапраўдны. Для другога рэцэпта тэрмін дзеяння вызначаецца з даты завяршэння дзеяння першага рэцэпта, для трэцяга рэцэпта — праз два месяцы пасля выпіскі першага рэцэпта. Для забеспячэння бесперапыннасці лячэбнага працэсу тэрміны дзеяння другога і трэцяга рэцэптаў могуць быць перанесеныя на 3-5 дзён да завяршэння тэрміну дзеяння папярэдняга рэцэпта! Гэтыя запісы на рэцэптах завяршаюцца подпісам і асабістай пячаткай урача. У медыцынскай картцы робіцца запіс аб выпісцы пацыенту трох рэцэптаў на льготных умовах або бясплатна, указваюцца нумары выпісаных рэцэптаў, і пацыент распісваецца, пацвярджаючы тым самым, што ён азнаёмлены з разлікамі і атрымаў рэцэпты на трохмесячны курс лячэння. Адначасова ўрач вызначае для пацыента дату наступнага планавага наведвання.

Фота БЕЛТА.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАК ПАПЯРЭДЗІЦЬ ВАКЦЫНАЦЫЯ

Вакцына ад раку шыйкі маткі ў бліжэйшы час стане даступнай жыхаркам Гродзенскай вобласці. Першая пробная партыя амерыканскай вакцыны «Цэрварыкс» прыбудзе ў Гродна ўжо ў красавіку, аднак вакцынаванне пакуль будзе ажыццяўляцца на платнай аснове, паведаміў карэспандэнту **БЕЛТА** намеснік галоўнага ўрача па анкалагічнай дапамозе Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы Ігар Мышко.

Паводле яго слоў, фірма-пастаўшчык гатовая даставіць у клініку любую колькасць вакцын, аднак аб'ём паставак абмяжоўвае дарагоўля працэдуры. У цяперашні час кошт вакцынацыі для адной пацыенткі складае $300—360. Вакцына паказана дзяўчынкам з 9—10-гадовага ўзросту і жанчынам дзетароднага ўзросту. Эфектыўнасць яе выкарыстання навукова даказана, яна ахоўвае ад раку на працягу 5 гадоў.

Рак шыйкі маткі з'яўляецца другім па распаўсюджанасці анкалагічным захворваннем сярод жанчын пасля раку малочнай залозы. Штогод у свеце ахвярамі раку шыйкі маткі становяцца каля 290 тыс. жанчын. Пераважная большасць выпадкаў гэтага захворвання звязана з уздзеяннем вірусу папіломы. Паводле статыстыкі, 80 працэнтаў жанчын, якія вядуць палавое жыццё, пашкоджаны гэтым вірусам, пры наяўнасці якога рызыка ўзнікнення анкапаталогіі ўзрастае ў 60 разоў.

Паводле слоў Ігара Мышко, у цяперашні час у Беларусі распрацоўваецца дзяржаўная праграма па папярэджанні ракавых захворванняў, і анколагі спадзяюцца, што меры па прафілактыцы раку шыйкі маткі сярод жанчын будуць у яе ўключаны.

Залежнасць

ЖОРСТКАЕ РАТАВАННЕ АЛКАГОЛІКА

У развіцці і лячэнні алкагольнай залежнасці даўно няма ніякіх сакрэтаў. Праблема толькі ў тым, што тэорыя складана «кладзецца» на практыку. Той, хто злоўжывае алкаголем і паціху «пагружаецца» ў залежнасць ад градусных напояў, лічыць, што выпіваюць усе. Сапраўды, колькасць такіх «пагружаных» у нашай краіне, мякка кажучы, немалая. Фактычна алкаголем злоўжывае кожны пяты мужчына працаздольнага ўзросту. З іншага боку, выпіваюць з нагоды і без, вядома, не ўсе. Як кажуць, якімі вачыма глядзець...

Паколькі асаблівасцю алкагалізму з'яўляецца поўнае адмаўленне хворым свайго захворвання, гэта інтэрв'ю з загадчыкам псіханеўралагічнага кабінета Цэнтральнай паліклінікі Міністэрства ўнутраных спраў Уладзімірам ІВАНОВЫМ — хутчэй для іх блізкіх, якія жадаюць ведаць, як супрацьстаяць праблеме.

Фота БЕЛТА.

— Наколькі я разумею, ёсць рэчы, жыццёва неабходныя чалавеку. А залежыць ён ад таго, што да «жыццёвай неабходнасці» дачынення не мае...

— У чалавека ёсць шэраг жыццёва важных патрэбаў. Скажам, патрэба ў ежы, вадзе, сне і сэксе. Усе яны праяўляюць сябе цыклічна — павінны задавольвацца час ад часу. Калі патрэба ў ежы, вадзе і сне не задавальняецца ўвогуле, чалавек гіне. Калі не задавальняецца сэксуальная патрэба, могуць развівацца неўратычныя ці псіхічныя расстройствы... Разам з тым існуе шэраг рэчываў, здольных выклікаць пачуццё глыбокай задаволенасці. Пры іх ужыванні мы адчуваем сябе так, быццам задаволілі адну з біялагічных патрэбаў. Рэчывы, пра якія ідзе размова, істотна мяняюць функцыянаванне арганізма ў цэлым і мозгу ў прыватнасці. Мала таго, размова ідзе не проста пра атруту. Інакш людзі б яе не ўжывалі. Наркотыкі, у тым ліку алкаголь і тытунь, валодаюць дваістым эфектам. З аднаго боку, іх ужываюць, калі маюць на мэце сябе актывізаваць, падбадзёрыць, а з другога, наадварот, каб заспакоіцца, расслабіцца, забыцца на праблемы. І адно, і другое дзеянне — безумоўна ілюзорнае. Незалежна ад таго, пакурылі мы ці выпілі, нашы праблемы застаюцца на тым узроўні, на якім мы іх пакінулі да ўжывання наркатычнага рэчыва.

— А чаму чалавек так моцна прагне глыбокай задаволенасці, расслаблення? Хіба не зразумела, што жыццё — гэта пераадоленне цяжкасцяў, работа над сабой, пакуты нарэшце?..

— Што датычыцца нашага грамадства, то варта ўлічыць, у якіх умовах, пад уздзеяннем якіх стэрэатыпаў раслі тыя, хто цяпер злоўжывае алкаголем, хто не скіраваны, як вы кажаце, на пераадоленне цяжкасцяў. Я, напрыклад, вырас у таталітарна-камуністычным грамадстве, скіраваным на стварэнне ілюзіі, што лепей, чым у гэтай вялікай краіне, не бывае. Шэраг пакаленняў не рыхтавалі да канкурэнцыі, барацьбы, работы над сабой і г.д.

Вялікую ролю, на мой погляд, адыграла і веравызнанне. Паводле тэкстаў, чалавек народжаны для пераадолення пакут, аднак даведацца, ці «абраны» ён, магчыма толькі пасля смерці. Царства Божае — не ад гэтага свету. У пратэстантызму — іншы падыход. Бог вызначае «абраных» па тым, наколькі ты паспяховы ў справах.

— З іншага боку, жыццё ў грамадстве ёсць пастаяннае падпарадкаванне яго законам, заглушэнне пэўных жаданняў і г.д. Мы пастаянна вымушаны штосьці трываць А калі пастаянна трываеш, то заканамерна паўстае пытанне: дзеля чаго?

— Заканамернае пытанне «ў чым сэнс жыцця?» — няпростае толькі на першы погляд. Адказ на яго даўно існуе. Паводле Бібліі, чалавек створаны для таго, каб праслаўляць свайго Стваральніка, упрыгожваць зямлю і пазнаваць свет. Вось тры пазіцыі глабальнага сэнсу жыцця для любога чалавека, нават калі ён атэіст... Праслаўленне Стваральніка можна разумець як пакланенне Яе Вялікасці Прыродзе.

— Можна меркаваць, што чалавек, захоплены наркатычнымі рэчывамі, «забываецца» на вышэйсказанае...

— Верагодна, так і ёсць. Калі чалавек не ўмее пераадольваць цяжкасці, не ўяўляе, як вырашаць тыя ці іншыя пытанні, не мае магчымасці задаволіць адну з патрэбаў, у тым ліку, дарэчы, сацыяльную — патрэбу ў зносінах з іншымі людзьмі, то ёсць рызыка, што яму спадабаецца падараная наркатычным рэчывам ілюзія задавальнення патрэбаў.

— Аднак залежнасць развіваецца далёка не ў кожнага, хто пакаштаваў той жа алкаголь...

— У некаторых людзей першая цыгарэта або першая чарка выклікаюць вялікае задавальненне, і залежнасць у такім выпадку развіваецца вельмі хутка. Проста арганізм нібыта фізіялагічна прыстасаваны для «ўвядзення» ў яго наркарэчываў. Такі чалавек выпівае чарку і... жадае паўтарыць гэты цудоўны стан. Я, напрыклад, курыў 28 гадоў. Бо мне падабаўся гэты занятак. І спадабаўся з першай спробы. Гэта чыстая біялогія...

— І не важна, што менавіта ты пакаштаваў першы раз — піва, віно?..

— Абсалютна не істотна. І піва, і віно таксама ўтрымліваюць «градусы». Важны і такі момант як даступнасць градусных напояў. Яшчэ ў 50-я гады мінулага стагоддзя Сусветная арганізацыя аховы здароўя паказала: чым таннейшы алкаголь у прадуктовым кошыку, тым больш яго ўжываюць. Незалежна ад іншых знешніх умоў, напрыклад, узроўню развіцця краіны. Кошт алкаголю ў гэтым выпадку вызначаецца коштам у дачыненні да хлеба, яек, каўбасы і іншых прадуктаў харчавання першай неабходнасці. Я памятаю, што за савецкім часам бутэлька гарэлкі каштавала 2 рублі 87 капеек і 13 капеек — плаўлены сырок. Так і скідваліся «на траіх» па рублі. Тады белы хлеб каштаваў 20 капеек, чорны — 14. У 15 разоў танней за алкаголь! А цяпер хлеб каштуе 1,5 тысячы рублёў, а гарэлка — 7...

— Якім жа чынам распазнаць «біялогію», у сэнсе, алкаголіка?

— Натуральна, алкаголікамі не становяцца за адну спробу. Спачатку чалавек проста выпівае з сябрамі, на святах, і яму, як мы сказалі, гэта падабаецца. І не важна, дарэчы, якому напою аддаецца перавага. Піва — таксама алкаголь. Піўны алкагалізм добра пакаваны ў матэрыялах даследчыкаў Паўднёвай Германіі, алкагалізм вінны — у матэрыялах Францыі... Паступова чалавек нават не заўважае, як бярэ бутэлечку таго ж піва на вечар ці проста выпівае чарку падчас вячэры, для апетыту... Алкаголь увахо дзіць у жыццё ў якасці харчовага прадукту. Праз нейкі час становіцца неабходным, як вада, ежа, сэкс і сон. Гэта значыць, калі чалавека пазбаўляюць алкаголю, ён перажывае дыскамфорт. Псіхалагічная цяга распазнаецца і па эмацыйнай рэакцыі: калі чалавек атрымлівае алкаголь, то радуецца, калі не — злуецца, становіцца агрэсіўным. Нават пры прадчуванні выпіўкі, планаванні «мерапрыемства» ў алкаголіка павышаецца настрой. Дрэнную службу адыгрывае і перакананасць у тым, што «выпіваюць усе». Калі я курыў, мне таксама здавалася, што ўсе кураць. А калі перастаў, то ўбачыў, што кураць не ўсе і што наогул не так яно і патрэбна...

З цягам часу нарастае талерантнасць да алкаголю, чалавек навучаецца пераносіць вялікія дозы. Натуральна, што арганізм хоча пазбавіцца атруты, і правакуе пры перавышэнні індывідуальнай дозы рвотны рэфлекс. У таго ж, хто пачынае ўжываць алкаголь рэгулярна, гэты рэфлекс заяўляе пра сябе пасля ўсё большай дозы. Так што чалавеку здаецца, быццам ён моцны, дужы, здаровы і ніякіх праблем у яго няма. Можа шмат выпіць — і ніякага ванітавання! А ў рэальнасці гэта ўжо прыкмета таго, што чалавек увайшоў у залежнасць. На высокіх дозах алкаголю развіваецца і амнезія ап'янення — асобныя прапалы ў памяці. Алкаголь вельмі лёгка размяркоўваецца па ўсіх тканках арганізма, наносіць удар па клетках любых органаў, у тым ліку галаўнога мозгу. Амнезія — сведчанне таго, што частка нейронаў галаўнога мозгу загінула.

Сістэмнае ўжыванне алкаголю ў рэшце рэшт прымушае чалавека звязваць з апошнім любую падзею — прагляд футбола, паход у лазню, сэкс і г.д. Адноўчы кантроль над дозай знікае ўвогуле. Усё, што ёсць, павінна быць выпіта, задача адна — выпіць усё і як мага хутчэй. Гэта ёсць першая стадыя залежнасці.

— На жаль, сам хворы нічога такога не ўсведамляе, не лічыць сябе хворым...

— Бо яму добра. Жыццё становіцца камфортным. Няма стрэсу, трывогі, ёсць кампанія...

— Некаторыя бацькі спакойна даюць аднагадовым дзецям піва... Наогул вядома, што першы раз большасць дзяцей і падлеткаў каштуюць алкаголь «з падачы» бацькоў...

— Я — бацька траіх дзяцей, у мяне растуць унукі, але ў нашай сям'і дарослыя ніколі не прапаноўвалі алкаголь малодшаму пакаленню. Я наогул за павышэнне ўзросту легальнага ўжывання алкаголю да 21 года. Дзяржава павінна даць дазвол на ўжыванне небяспечнага, цяжкага наркотыку, якім і з'яўляецца алкаголь, толькі таму, хто стаў дарослым.

— Што вы параіце так званым сузалежным, сваякам хворага на алкагалізм?

— Не чакаць цудаў! І больш актыўна шукаць арганізацыі і спецыялістаў, якія здольны дапамагчы. Іх зараз нямала. Тое ж таварыства ананімных алкаголікаў, тэрапеўтычнае таварыства «Каўчэг», дзе навучаюць эфектыўнай тэхналогіі падтрымання штодзённай цвярозасці. Калі ласка, кантактны тэлефон нашага «Каўчэга» ў Мінску — 223 76 81.

— Але ж не так проста зацягнуць залежнага да гэтых самых спецыялістаў...

— Неабходна ставіць яго ў такія жорсткія ўмовы, каб ён пагадзіўся на гэты кантакт. Алкагалізм — хвароба жорсткая, і блізкім варта дзейнічаць такім жа чынам. Перш-наперш, не дапамагаць — не выплачваць пазыкі, не вызваляць з выцвярэзніка, не закрываць вочы на прагулы на працы...

— Вы хочаце сказаць: чым больш камфортнае жыццё ў алкаголіка, тым менш шанцаў спыніць бясконцы запой?

— Абсалютна правільна. На якія дзеянні мае права, напрыклад, жонка ў сітуацыі з мужам-алкаголікам? Толькі на тыя, ад якіх будзе залежаць ратаванне жыцця апошняга. Але нельга яго карміць, распранаць, урача выклікаць, тым больш пахмяляць, даваць грошы... Я ведаю шэраг людзей, якія былі ўратаваныя толькі такім жорсткім чынам. Ды і наогул любая жанчына, калі мы ўжо гаворым пра жонак алкаголікаў, мае права абараняць сваё фізічнае і псіхічнае здароўе, нармальнае жыццё сваіх дзяцей. Калі ж яна будзе «падтрымліваць» пітушчага мужа, ёй давядзецца адпакутаваць і, хутчэй за ўсё, прайсці з ім усе стадыі развіцця захворвання.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

ОАО «ЛМЗ УНИВЕРСАЛ»

г. Солигорск, ул. Заводская, 4

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2009 год *(млн руб.)*

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
АКТИВ			
1. Внеоборотные активы	190	19401	19933
2. Оборотные активы	290	16793	26940
БАЛАНС	300	36194	46873
ПАССИВ			
3. Капитал и резервы	490	32096	42434
4. Обязательства	590	4098	4439
БАЛАНС	600	36194	46873

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2008 год *(млн руб.)*

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	Период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	89786	54026
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	58311	37734
Управленческие расходы	040	—	—
Прибыль (убыток) от реализации	060	16863	7118
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	111	114
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	- 1269	- 777
Прибыль (убыток) за отчетный период	200	15705	6455
Налоги и сборы, производимые из прибыли	250+260+270	4627	2009
Прибыль (убыток) к распределению	300	11078	4446
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде		132	155,32

Количество акционеров – всего 892, в том числе физических лиц 892.
Просроченная дебиторская и кредиторская задолженность отсутствует.
Среднесписочная численность работающих – 824 человека.
Основной вид деятельности – производство машин и оборудования для горнодобывающей промышленности и разработки карьеров (код по ОКЭД 29521).

УНП 600122531

ПРЯЛЬНИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 3 (Трех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок в деревне Петрусовщина, площадь участка — 0,2500 га, начальная цена 1 500 000 белорусских рублей;
Лот 2 — земельный участок в деревне Петрусовщина, площадь участка — 0,2500 га, начальная цена 1 500 000 белорусских рублей;
Лот 3 — земельный участок в деревне Петрусовщина, площадь участка — 0,2500 га, начальная цена 1 500 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Аукцион состоится **29 апреля 2009 года в 11.00** по адресу: деревня Пряльники, ул. Молодежная, дом 3, здание сельисполкома. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28 апреля 2009 года до 17.00. Аукцион состоится по адресу: д. Пряльники, ул. Молодежная, 3, кабинет секретаря.

ПРЯЛЬНИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 3 (Трех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 4 — земельный участок в деревне Петрусовщина, площадь участка — 0,2500 га, начальная цена 1 500 000 белорусских рублей;
Лот 5 — земельный участок в деревне Петрусовщина, площадь участка — 0,2500 га, начальная цена 1 500 000 белорусских рублей;
Лот 6 — земельный участок в деревне Петрусовщина, площадь участка — 0,2500 га, начальная цена 1 500 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Аукцион состоится **30 апреля 2009 года в 11.00** по адресу: деревня Пряльники, ул. Молодежная, дом 3, здание сельисполкома. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 29 апреля 2009 года до 17.00. Аукцион состоится по адресу: д. Пряльники, ул. Молодежная, 3, кабинет секретаря.

Контактный телефон (8 01772) 31236.

УНП 600059273

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ

ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ЭЛЕМА»

Адрес: 220033, г. Минск, ул. Тростенецкая, 5. УНП 100074549

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2009 года млн руб.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	29 918	31 355
амортизация	102	18 941	19 858
остаточная стоимость	110	10 977	11 497
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	17	17
амортизация	112	13	14
остаточная стоимость	120	4	3
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость	121	—	—
амортизация	122	—	—
остаточная стоимость	**130**	—	—
Вложения во внеоборотные активы	140	401	187
В том числе: незавершенное строительство	141	—	—
Прочие внеоборотные активы	150	—	—
ИТОГО по разделу I	**190**	**11 382**	**11 687**
I I. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	25 135	33 687
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы`	211	5 001	9 343
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	838	1 681
расходы на реализацию	214	175	169
готовая продукция и товары для реализации	215	13 748	15 591
товары отгруженные	216	5 169	6 659
выполненные этапы по незавершенным работам	217	—	—
расходы будущих периодов	218	204	244
прочие запасы и затраты	219	—	—
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	1 183	1 521
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	—	—
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	1 364	1 842
В том числе: покупателей и заказчиков	241	688	367
поставщиков и подрядчиков	242	76	65
по налогам и сборам	243	261	921
по расчетам с персоналом	244	114	195
разных дебиторов	245	222	284
прочая дебиторская задолженность	249	3	10
Расчеты с учредителями	250	—	—
Денежные средства:	260	465	1 184
В том числе денежные средства на депозитных счетах	261	—	284
Финансовые вложения	270	68	69
Прочие оборотные активы	280	793	27
ИТОГО по разделу I I	**290**	**29 008**	**38 330**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**40 390**	**50 017**
ПАССИВ			
I I I. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	537	537
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	—	—
Резервный фонд	420	1 039	1 330
В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	1 039	1 330
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422	—	—
Добавочный фонд	430	12 412	12 412
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	—	—
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	11 687	14 867
Целевое финансирование	460	—	—
Доходы будущих периодов	470	—	—
ИТОГО по разделу I I I	**490**	**25 675**	**29 146**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	—	—
Прочие долгосрочные обязательства	520	—	—
ИТОГО по разделу IV	**590**	—	—
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	1 769	1 077
Кредиторская задолженность	620	12 945	19 794
в том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	11 206	17 496
перед покупателями и заказчиками	622	309	453
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	684	892
по прочим расчетам с персоналом	624	2	—
по налогам и сборам	625	537	553
по социальному страхованию и обеспечению	626	154	216
по лизинговым платежам	627	—	—
перед прочими кредиторами	628	53	184
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	—	—
Резервы предстоящих расходов	640	1	—
Прочие краткосрочные обязательства	650	—	—
ИТОГО по разделу V	**690**	**14 715**	**20 871**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**40 390**	**50 017**
краткосрочная кредиторская задолженность	702	12 945	19 794
Материалы, принятые в переработку	03	731	513
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	2 015	1 785
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	13	14
Потеря стоимости основных средств	014	198	204

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2008 г. по 31 декабря 2008 г.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
1. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	95 392	70 587
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	11 112	8 441
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	84 280	62 146
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	68 397	50 026
Валовая прибыль (020-021-030)	040	15 883	12 120
Расходы на реализацию	060	4 704	3 808
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	**070**	11 179	8 312
I I. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	28 959	25 265
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	18	19
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	28 941	25 246
В том числе: проценты к получению	091	50	8
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092	2	2
доходы от операций с активами	093	28 887	25 222
прочие опера

Наш культурны асяродак

Жыроандоля

Выпуск № 5 (51)

Радавыя Перамогі

Крыжы, якія падаюць

У Белавежскай пушчы, у самай глыбіні векавога лесу стаіць унікальны помнік ахвярам фашызму. Называецца ён «Крыжы, якія падаюць». З розных бакоў аграмадныя бетонныя стэлы выглядаюць па-рознаму. Калі падыдзеш прама, яны глядзяцца як слупы і перакладзіны, ступіш крок управа або ўлева — здаецца, манумент нахілены ўперад, а глянеш на яго збоку: сапраўдныя крыжы, якія вось-вось упадуць на зямлю.

Крыжы, якія падаюць.

За гэтымі незвычайнымі крыжамі да гэтай пары прыкметны равок, у якім знайшлі спачын больш за сто расстраляных вяскоўцаў. Іх закатавалі ў першыя дні жніўня 1941 года. У іншых рэгіёнах фашысты пачалі лютаваць пазней, калі адчулі супраціўленне насельніцтва, дзейнасць партызанаў. А тут толькі прыйшлі — пачалі збіраць мясцовых актывістаў, а разам з імі часта і тых, хто пад руку трапіць, людзей зганялі ў лес. З лесу яны ўжо не вярнуліся.

У Вольгі Іванаўны Улезла, жыхаркі вёскі Белы Лясок, там застаўся бацька, стрыечная сястра Ліда, суседзі, знаёмыя. 12-гадовая Вольга жыла тады ў Белавежы, вёсцы, якая пасля вайны стала тэрыторыяй Польшчы. Бацька яе Іван Козак быў дэпутатам мясцовага Савета. Гэтага хапіла, каб запісаць яго ў ворагі рэйха. А вось дваццацігадовая прыгажуня Любачка, што тры тыдні таму нарадзіла дзіця, не была ні камсамолкай, ні актывісткай. Нехта са злаславіўцаў шапнуў карнікам, што спявала на сцэне бальшавіцкага клуба. Вось і пайшла на пагібель разам з іншымі. Вольга Іванаўна і цяпер без слёз не можа ўспамінаць той дзень, калі яна апошні раз бачыла бацьку. Яму скруцілі рукі і выпхнулі з хаты, не далі нават на развітанне пацалаваць дзяцей. Многа гора нацярпеліся яны з маці, братам і сястрой за гады вайны. А ў канцы 40-х, як вядома, па карце правялі новую лінію. І маці са старэйшымі дзецьмі апынулася ў Польшчы, а Вольга, якая выйшла замуж у Белы Лясок — у Беларусі. На беларускай тэрыторыі засталася брацкая магіла іх родных, аднавяскоўцаў і жыхароў суседніх вёсак.

На магіле спачатку паставілі сціплы абеліск. А ў 1980 годзе па праекце польскіх архітэктараў пружанскія будаўнікі ўзвялі мемарыял, які стаіць у пушчы і сёння. Нядаўна помнік пяражыў рэканструкцыю, яно і зразумела — за дзесяцігоддзі бетон пачаў дзе-нідзе разбурацца. Да яго не зарастае сцежка. І зараз, у сакавіку, каля пліты з надпісам стаялі кветкі і лампадкі, зацярушаныя снегам. Але пасля ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз, калі быў адменены спрошчаны пераход мяжы для жыхароў прыгранічных раёнаў, да помніка прыходзіць значна менш людзей. Пачынаючы недзе з 60-х гадоў, кожнае лета ў апошнюю нядзелю жніўня побач з мемарыялам праводзілі жалобнае мерапрыемства. З польскага боку прыходзіла 100-120 чалавек, збіралася прыкладна столькі ж людзей з навакольных вёсак Пружаншчыны. Гэта былі сустрэчы былых суседзяў, родзічаў, сямейнікаў. Да памянёнай Вольгі Улезла прыязджала дачка з Тальяці, спецыяльна брала водпуск на гэты час, каб сустрэцца з цёткай, дзядзькам, іх дзецьмі і пакланіцца дзядулевай магіле.

Памяць ахвяраў вайны, бывала, ушаноўвалі і на другім баку мяжы. Брацкая магіла жыхароў вёскі Чадзель Пружанскага раёна цяпер знаходзіцца ў Польшчы. Але апошнім часам усё змянілася. Каб перайсці мяжу, трэба звяртацца ў пасольствы і консульствы, адкрываць візы. А дзецям тых, хто застаўся ў пушчанскім раёну, зараз каля васьмідзесяці гадоў. І хоць непадалёку ад помніка дзейнічае пешаходны пераход «Перароў-Белавежа», па спісах, як было раней, пераходзіць мяжу нельга. Таму апошнія гады ў канцы жніўня мерапрыемствы каля «Крыжоў» ладзяцца намнога больш сціплыя. Як правіла, на беларускі бок прыходзіць невялікая дэлегацыя Гайнаўскага павета і гміны Белавежа. Збіраюцца жыхары навакольных беларускіх вёсак. Усе разам кладуць кветкі да помніка.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

Край зямлі

Балотная Атлантыда

магла захаваць нават сляды канібалаў

Археалагічную навуку ў нейкай ступені можна параўнаць з працай дэтэктыва на месцы злачынства, калі той па знойдзеных рэчах паслядоўна аднаўляе падзеі здарэння. І часам можа раскапаць сапраўдную сенсацыю з жыцця нашых далёкіх продкаў, якая дазваляе выказаць гіпотэзу наконт існавання на тэрыторыі Беларусі канібалізму некалькі тысячагоддзяў таму...

Пад покрывам тайны

Да такіх разваг прыйшлі археолагі ў выніку даследавання ўнікальных помнікаў на тарфяніках, дзе ў вялікай колькасці выявілі чалавечыя косткі, як не кранутыя агнём, так і перапаленыя. Знаходзілі іх нават у межах колішняга паселішча. Пры гэтым большая частка чалавечых костак амаль не адрозніваецца ад «кухонных парэшткаў» з костак жывёл...

— Некаторыя з іх могуць адносіцца да рытуальных пахаванняў у межах паселішча, аднак частка выклікае падазрэнне адносна існавання ў канцы неаліту — бронзавым веку на тэрыторыі беларускага Падзвіння канібалізму, верагодна, рытуальнага. Усе цывілізацыі свету прайшлі праз канібалізм...— гасіць маё абурэнне **Максім ЧАРНЯЎСКІ, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**. Але ён жа выказвае і іншую версію магчымага развіцця падзей.

Каб зразумець, як магло быць насамрэч, мы прапануем паглядзець на наша мінулае вачамі даследчыка, які прычыніўся да раскрыцця таямніц гісторыі нашай зямлі: чаму выглядае так, што Падзвінне ў старажытнасці было менш заселена людзьмі? Навукоўцамі разглядаліся некалькі гіпотэз, якія спрабавалі патлумачыць прычыны, — магчыма, існавалі нейкія табу на засяленне гэтай тэрыторыі, ці прайшлі эпідэміі, якія вынішчылі насельніцтва гэтага краю. Аднак наблізіцца да разгадкі стала магчыма, калі ў выніку меліярацыйных работ былі выяўлены найбагацейшыя паселішчы на тарфяніках, на якіх людзі жылі яшчэ за тысячы гадоў да нашай эры.

Прыхаваныя скарбы

Паселішчы на тарфяніках — з'ява сапраўды ўнікальная. Найбольш вядомыя ў Беларусі размешчаны на Крывінскім тарфяніку, што знаходзіцца на мяжы Бешанковіцкага і Сенненскага раёнаў Віцебскай вобласці. Байкамі пра гэтыя непразазныя балоты старыя людзі яшчэ напачатку мінулага стагоддзя палохалі дзяцей: нібыта на востраве сярод балота хаваліся паўстанцы-паны, плавалі на лодках, сярод ночы прыплывалі да вёсак... Ці не прывіды гэта былі балотных жыхароў?

Праз гэта балота працякала рэчка Крывінка. У 30-х гадах вырашылі рэчку ператварыць у канал, балота асушыць і здабываць торф. Капалі ўручную. Рабочыя з навакольных вёсак звярнулі ўвагу, што ў адным месцы замест торфу пачалі сустракацца бітыя гаршчкі, кавалкі дрэва, кары, косткі, вуголле і нават пясок. Некалькі фрагментаў керамікі патрапілі ў Мінск да археолагаў. Даследчыкі К.М. Палікарповіч і А.Д. Каваленя былі першымі, хто вывучаў самы першы помнік археалогіі на Крывінскім тарфяніку, які да нашых дзён здзіўляе даследчыкаў.

Калісьці гэта было вялікае возера, ці некалькі азёраў, злучаных паміж сабой пратокамі, досыць плыткіх. Сутнасць у тым, што 5—4 тысячы гадоў таму клімат быў іншым — памяркоўна цёплым і даволі сухім. Узровень азёраў быў ніжэйшы за сучасны прыблізна на 1,5 метра. А гэта значыць, што берагавая лінія знаходзілася на адлегласці дзясяткаў, а то і сотняў метраў ад цяперашняй. І тагачасныя жыхары якраз там і заснавалі свае паселішчы. А калі клімат стаў больш вільготным, то азёры пачалі расці, вада наступала на паселішчы. Людзі былі вымушаны пераходзіць на новае месца. У канцы другога тысячагоддзя да нашай эры паселішчы былі канчаткова паглынутыя азёрамі, якія з цягам часу затарфаваліся, прыхаваўшы на доўгія тысячагоддзі скарбы сваіх жыхароў.

На раскопе старажытнага жытла.

Торф як лепшы кансервант

— Торф з'яўляецца цудоўным кансервантам і не дапускае да матэрыялаў паселішчаў кісларод — асноўную прычыну гніення, — тлумачыць Максім Чарняўскі. — Таму археалагічных знаходак на месцы размешчаных на тарфяніках паселішчаў нашмат больш, чым, напрыклад, на Панямонні з яго мяккім пяском, хоць там літаральна на кожным метры можна знайсці сляды жыццядзейнасці чалавека на тысячы гадоў у старажытнасць. Але пясок абсалютна не захоўвае арганічныя рэчы. Калі капаць паселішча каменнага ці бронзавага веку, то з матэрыялаў будуць толькі кераміка і крэмень. Усё астатняе перагнівае і знікае. Але паселішчы на тарфяніках даюць нам мажлівасць пабачыць, памацаць рукамі не толькі кераміку і крэмень, а яшчэ вырабы з косткі і рога, посуд з дрэва, напрыклад, старажытную флейту і бурштынавыя ўпрыгажэнні.

Прыгажосць і каштоўнасць бурштыну нашы продкі зразумелі здаўна. Прыгожыя «сонечныя» камяні, а таксама і ўжо гатовыя ўпрыгажэнні траплялі на нашае Паазер'е па Дзвіне, якая была своеасаблівым абменным шляхам паміж роднаснымі плямёнамі, што насялялі тады Прыбалтыку і Поўнач Беларусі. Далей бурштын патрапляў на Падняпроўе, яго мянялі на крамянёвыя сякеры і, у бронзавым веку, на першыя металічныя прылады і ўпрыгажэнні.

Нашы далёкія продкі ўладкаваліся вельмі зручна: маглі займацца абменам з карысцю для сябе.

Першая падлога ў доме

Максім Чарняўскі год таму даследаваў паселішча, якое было размешчана на торфе. Прыблізна ў самым пачатку 2-га тысячагоддзя да нашай эры адбылося невялікае памяншэнне плошчы азёраў, яны адступілі і агалілі частку тарфянога берага. Пасля таго, як торф абсох, людзі пасяліліся бліжэй да вады.

Яны будавалі выцягнутае жытло, напаўна, на некалькі сем'яў. Даследчыкі цалкам пакуль не знайшлі ніводнага будынка, толькі фрагменты. Але дзякуючы таму, што торф захаваў драўляныя канструкцыі, можна нават уявіць камфорт старажытных хатак: канструкцыя трымалася на калах з расохамі (рагулінамі) зверху, на іх клалася бэлька, з якой будаваўся двухскатны дах, зверху ён пакрываўся трыснягом.

Але торф занадта халодны, каб на ім жыць. Таму ўжо тады прыдумалі асаблівы варыянт падлогі. На торф накідвалі высечаны хмызняк, потым высцілалі гэты хмыз карой сасны, пасля па высцілцы насыпалі пяску (па які трэба было спецыяльна ісці за сотні метраў), зноў высцілалі гэты пясок карою, насыпалі пясок і на ім пачыналі жыць. Не гліняныя рабілі падлогі, а пясчаныя. Праз нейкі час яны разбіваліся нагамі, перамешваліся з брудам. А потым людзі разумелі: жытло зусім дрэнна выглядае і насыпалі наступны пласт пясчанай падлогі, рабілі рамонт і чысцілі ў хаце.

Парог як месца продкаў

А што да непрыемнага «кампрамату» з чалавечых костак, якія захаваў торф... Ёсць яшчэ адно тлумачэнне гэтай з'яве.

Частка чалавечых костак у межах размяшчэння жытла можа быць звязаная з пахаваннямі. Вядома, што ў розных народаў свету ўжо ў новай гісторыі этнографы фіксавалі такія звычаі. І тут трэба ўзгадаць некаторыя беларускія традыцыі, якія дайшлі да нас ад продкаў: нельга вітацца праз парог, нельга нявесце стаць на парог. Але калі выносяць нябожчыка з хаты, то абавязкова трэба труной грукнуць аб парог — паведаміць продкам, каб чакалі госця. Хоць даўно перасталі хаваць людзей у межах жытла, але ідэя захавалася, што парог — гэта жытло не толькі для жывых, але і для продкаў.

Тады і сапраўды былі цяжкія часы, трэба было выжыць. Ежу здабывалі аддусюль. У раскопках ёсць дзве найбольш масавыя катэгорыі знаходак: фрагменты керамікі і косткі. Людзі перапрацоўвалі забітую жывёлу, гатавалі ежу, а з яе костак рабілі прылады і ўпрыгажэнні. Палявалі на ўсё, што магло рухацца: на мядзведзяў, зуброў, тураў, зайцоў, собаля, вавёрку, лісу і птушак. Знаходкі на тарфяніках даюць магчымасць уявіць старажытнага рыбака, які меў добрую аснастку: акрамя таго, што лавіў на кручкі з костак, мог карыстацца сеткамі, гарпунамі, вудамі, бучамі з драўляных лучынак. Знаходзілі нават грузілы — гліняныя і каменныя, берасцяныя паплаўкі — такія ж да гэтага часу можна ўбачыць у старых вёсках на Паазер'і і Палессі...

Наканавана выжыць

— Мы не можам даць гарантыі, што знайшлі ўсе паселішчы на гэтым тарфяніку, — гаворыць Максім Чарняўскі, які даследуе яго ўжо 10 гадоў услед за бацькам-археолагам. — Калі мы даследавалі паселішча, найбольш аддаленае ад старажытнага берага, то думалі, што бліжэй да цэнтра балота ўжо не мае сэнсу шукаць. А ў 99-м годзе здарыўся тарфяны пажар. Праз год мы прыехалі капаць паселішча Асавец-2, якое даследуецца з 66-га года і лічыцца адным з найбагацейшых помнікаў Усходняй Еўропы. Тады Міхась Міхайлавіч Чарняўскі выйшаў паглядзець: а раптам? І на адлегласці 300 метраў у бок цэнтра тарфяніка на папялішчы раптам пайшла кераміка... Адкрылася новае найбагацейшае паселішча. Каля вёскі Асавец вядома ўжо 7 помнікаў таго часу. А з другога боку тарфяніка ёсць вёска Галоўск, каля яе вядомы яшчэ 3 помнікі...

Паселішчы Крывінскага тарфяніка бесперапынна існавалі больш за 2000 гадоў, пакуль возера не затапіла іх, і над імі не ўтварылася непразазнае балота.

Ларыса ЦІМОШЫК, Максім ЧАРНЯЎСКІ.

Паселішчы Крывінскага тарфяніка. Арнаментаваная касцяная флейта, бурштынавыя падвескі і гузік, касцяныя амулеты, арнаментаваны берасцяны паплавок.

Ліберская гаўрыдня, або Тайная мова янаўскай мафіі

— Тук, тук, тук, — у начной цішыні грукат здаваўся страшэнна гучным.

Дзверы, скрыпучы, адчынілі ся, і праменьчык святла на секунду прарэзаў густую цемру.

— Т-с-с, сапай (маўчы!), — шэптам перасцярог гаспадар хаты (пахазы). Фігура, якая стаяла на парозе, нібы прасачылася ў шчыліну, што ўтварылася, і пасля невялікай валтузні ўсё зноў сціхла.

Гаспадар упэўніўся, што ўсе сабраліся, і далучыўся да тых, хто сядзеў за сталом і перад кім стаяў пачастунак і шклянкі з брагай. Зрэшты, гутарка і без спіртнога была ажыўленай, але калі б нават хтосьці захацеў яе падслухаць, быў бы вельмі расчараваны, таму што не зразумеў бы ні аднаго слова.

...Тыя, хто сабраўся пад покрывам ночы ў невялікім беларускім мястэчку Янаў (сёння Іванава), былі прадстаўнікамі асаблівай касты, або, кажучы сучаснай мовай, мафіі, якая называецца лабарамі, таму з меркаванняў канспірацыі гаварылі на зусім асаблівай мове, слэнгу — забытай і практычна страчанай сёння «ліберскай гаўрыдні». На гэтым экзатычным дыялекце размаўлялі (гаверндалі) на самыя розныя тэмы. Гэту мову вельмі добра ведалі ўсе мужчыны-лабары, а хлопчыкі вывучалі яе з 7 гадоў, таму што лабарства лічылася спадчынным заняткам: калі бацька меў такую «спецыяльнасць», то і сын аўтаматычна ўліваўся ў гэты саюз. Тайная мова ўяўляла сабой запазычанні з розных моваў і дыялектаў — грэчаскай, лацінскай, нямецкай, рускай і многіх іншых. Сустракаліся проста скажоныя словы і неалагізмы.

Знешне янаўскія «мафіёзі» нікольк не адрозніваліся ад астатніх прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва — карэнных палешукоў. Сярэдняга росту, з цёмнымі валасамі і карымі вачыма, светлымі тварамі з правільнымі рысамі. Аднак апрануты яны былі значна лепш за простых сялян, хутчэй, нават франтавата — кароткія кажухі са скураным поясам, скураныя боты з доўгімі халявамі і чорныя суконныя шапкі з брыльком. А на свята ўвогуле прыбіраліся ў шэрую світку з чырвонымі закаўрашамі і вялікую шапку з шэрай аўчыны.

Абмеркаваўшы свае надзённыя праблемы, усе ўдзельнікі, як сказалі б сёння, «круглага стала», гэтак жа ціха, як і прыйшлі, растварыліся ў начным змроку. Жанчыны, натуральна, былі ў курсе таго, што адбываецца, але прывычныя да бясконцых тайнаў сваіх мужоў, у мужчынскія справы не ўмешваліся, тым больш што загадкавай мове іх не вучылі.

Такая таямнічасць мела глыбокія карані. Сутнасць у тым, што ў XVIII—пачатку XX стагоддзя сярод жыхароў беларускага мястэчка Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Янава Палескага распаўсюдзіўся рэдкі занятак, які можна з натяжкай назваць промыслам. Ён заключаўся ў зборы адхвяраванняў на царкоўныя патрэбы. Янаўцы, якія займаліся гэтай добраахвотнай экспрапрыяцыяй, называліся лабарамі.

Адносна паходжання самога слова «лабар» існуе некалькі версій. Многія даследчыкі лічаць, што яно паходзіць ад імя памешчыцы Лабарыні, толькі ніхто не ведае дакладна, ці існавала гэта памешчыца насамрэч або гэта — плод уяўлення. Больш верагодна, што назва «лабар» паходзіць ад лацінскага labor — работа. Амаль усе мужчыны-хрысціяне мястэчка былі ўцягнутымі ў гэты працэс. Паступова ў свядомасці сялян словы яновец і лабар сталі сінонімамі. У іншых мясцовасцях такіх зборшчыкаў называлі прашакамі або кубракамі. Уласна кажучы, нічога асаблівага ў гэтай «спецыяльнасці» не было, проста многія лабары, мякка кажучы, далёка не ўсе сабраныя сродкі аддавалі ў царкоўную казну «плюснаму пахазніку» — царкоўнаму старасту, таму хутка абагачаліся, выклікаючы ў суайчыннікаў не вельмі прыемныя пачуцці. Лабары таксама не вельмі ўжо любілі местачкоўцаў і сялян, называючы іх паблажліва — «мэць». Пракантраляваць працэс збору сродкаў і колькасць грошай, якія не паступаюць у царкоўную казну, было практычна немагчыма. Праўда, пэўныя спробы нейкім чынам злавіць лабараў на махінацыях усё ж рабіліся. Напрыклад, ім выдаваліся спецыяльныя кніжкі (рапсанкі) з сургучнай пячаткай і пасведчаннем кансісторыі. У іх трэба было запісваць колькасць сродкаў, ахвяраваных царкве (плюсе). Але хто сказаў, што гэтыя запісы рабіліся заўсёды і ўсімі? Да ўсяго іншага, ахвяраванні рабіліся не толькі грашыма, але і натуральнымі прадуктамі, якія, як правіла, заставаліся ў лабараў.

З гадамі ў гэтых людзей выпрацоўваліся своеасаблівыя псіхалогія і рысы характару, культура побыту, сямейныя адносіны і звычаі. Узровень жыцця сям'і зборшчыкаў царкоўных ахвяраванняў непасрэдна залежаў ад іх асабістых якасцяў, у асноўным ад ведання псіхалогіі ахвяравальнікаў, уменняў знайсці падыход да кожнага паасобку, хітрасці, хуткай рэакцыі, выкрутлівасці, кемлівасці. Акрамя таго, далёкія падарожжы — лабараў можна было сустрэць не толькі ў Беларусі, але і ў Коўне, Вільні, Маскве і Пецярбургу — давалі ім магчымасць пашыраць свой кругагляд і станавіцца больш культурнымі і адукаванымі.

...Надышла ранняя восень. З палёў сабралі ўраджай, толькі ў садах яшчэ засталіся позняя яблыкі і грушы. Увечары да знаёмай нам хаты сталі збірацца людзі — суседзі, сябры, знаёмыя. У двор вынеслі доўгія сталы, балазе надвор'е стаяла яшчэ цёплае, карыконькі (дзяўчаты), цубы (старэйшыя жанчыны) і нават ёркі (старыя) хутка і спорна сталі выносіць (тарабаныць) стравы. Акрамя звычайнай бульбы (тарыжнікаў), на стале з'явілася яечня (кітошніца) на парадных талерках (наклюжах), вараная курыца (шурпа), малочнае парася (керхунчык) з хрэнам і іншая ежа (тройня) і, зразумела, бутэлькі з самагонам (пляхі). Зрэшты, гаспадар дома і яго сябры-лабары не спяшаліся куляць чаркі (ставеркі). Ноччу ім трэба было пакінуць свае родныя дамы і выправіцца ў далёкі шлях. Ехалі звычайна ўдвух або ўтрох — інакш падарожнічаць па дарогах (строках) было небяспечна — лічыя людзі маглі абрабаваць і нават забіць.

Лабары не бралі ўдзел у агульнай весялосці — ім трэба было падумаць аб сваіх праблемах: напрыклад, аб тым, як жонка справіцца без іх з гаспадаркай, свойскай жывёлай і дзецьмі. Магчымасць перадаць вестачку або пісьмо (рэпсэнына) выпадала далёка не заўсёды. Зрэшты, час мінаў хутка, і вясной, абавязкова перад Вялікаднем, зборшчыкі ахвяраванняў вярталіся дадому, дзе ім наладжвалася ўрачыстая сустрэча з багатым баляваннем. Суседзі ведалі — лабары ніколі не былі сквапнымі (шкнырамі).

Вось тады пачыналася сапраўдная весялосць — з музыкай, танцамі і забавамі!

Пасля 1939 года лабарства як спецыяльнасць знікла разам з цэрквамі і храмамі, якія таксама знікалі. Адасобленасць лабара страціла сэнс, адпала неабходнасць у канспірацыі і — як вынік — у тайнай мове. Сёння ў Іванаве, былым Янаве Палескім, далёка не ўсе ведаюць, што была ў айчыннай гісторыі такая з'ява — лабары. Зрэшты, тыя, хто ў курсе, ставяцца да гэтай старонкі мінуўшчыны далёка не адназначна.

Надзея СУСЛАВА.

Каб ведаць і памятаць

Выданні

Нямала хто з журналістаў марыць напісаць з цягам часу кніжку. Але далёка не ў кожнага гэта атрымліваецца. Каб мець сваю кніжку, напачатку, безумоўна, трэба мець сваю тэму. Прычым добра асвоеную тэму, так бы мовіць — вынашаную, выпакутаваную... У ранейшага супрацоўніка «Звязды» Яраслава Чаплі такая тэма знайшлася. Яшчэ падчас сваёй журналісцкай працы ў «Звяздзе», як ён сам жа зазначае пра гэта ў сваёй нядаўна выдадзенай кніжцы, калі ў 1990 годзе для даследчыкаў пачалі адкрывацца савецкія архівы, ён «спрычыніўся да вывучэння матэрыялаў па калектывізацыі ў Беларусі на пачатку трыццатых гадоў».

І чым глыбей учытваўся ў дакументы, чым падрабязней распытваў сведкаў тых падзей — у рэспубліцы і ў Архангельскай вобласці — тым больш драматычным паўставаў перад ім «працэс разбурэння натуральнага ходу развіцця сельскай гаспадаркі на Беларусі». Нарыс Яраслава Чаплі, надрукаваны ў газеце, з'явіўся адной з першых публікацый на гэту тэму. Прычым не толькі з яго асабістых публікацый, але і ўвогуле ў рэспубліцы. Магчымасці газеты, аднак, былі далёка не дастатковымі для таго, каб поўнасцю выкласці матэрыял, назапашаны падчас вывучэння архіўных дакументаў, спецыяльных камандзіровак і сустрэч з людзьмі (сведкамі і ўдзельнікамі тых падзей). Выкрышталізавалася ідэя напісаць кніжку, а ў выніку апошняя і з'явілася — пад добра запамінальнай назвай «Кулацкі эшалон» (Мінск, «Канфіда», 2008 г.).

Што ўдалося ў гэтай кніжцы аўтару, які, дарэчы, як ён таксама прызнаецца, не ставіў сваёй мэтай зрабіць выключна навуковае даследаванне (гэта, аднак, ніколькі не адмаўляе фактычнасці, праўдзівасці матэрыялу)? Яму ўдалося, можа, самае галоўнае — перадаць дух таго драматычнага часу. У кніжцы апавядаецца пра тое, як падчас калектывізацыі нямала якія беларускія сялянскія сем'і былі аб'яўлены кулацкімі, а ў выніку падлягалі высяленню са сваіх родных месцаў і прымусоваму перасяленню ў неабжытыя мясціны паўночнага краю савецкай краіны, Сібіры і Далёкага Усходу. Пры гэтым аўтар пераважна даследуе перасяленне беларускіх кулакоў на Поўнач.

Варта тут жа ўдакладніць, што звычайна ўяўляў сабой так званы беларускі кулак. Апісанне таго, што мела беларуская «кулацкая» сям'я, сустракаецца ў кніжцы даволі часта, прывядзём дакументальна засведчаны кулацкі вобраз адной з такіх сем'яў — сям'і Агрыжкаў з Лепельскага раёна, у якой было 8 дзяцей. Дык вось, у гэтай шматдзетнай сям'і была наступная гаспадарка: 2 каровы, 2 кані, 6 авечак, некалькі свіней, 8 дзесяцін зямлі. Зразумела, каб пракарміць такую сям'ю, дарослым, па сутнасці, трэба было дзень і ноч не разгінаць спіны. Але вось парадокс: менавіта працавітасць, добра вядомая беларуская працавітасць, нярэдка і ўказвала на чалавека як на кулака. Драматычны, супярэчлівы час... Загнаны ў рамкі сацыялістычнага перавыхавання працавіты беларускі селянін, які часам сам не разумеў таго, што адбывалася...

Аўтар з дапамогай тых жа архіўных дакументаў дакладна прасочвае адну з галоўных мэтаў гэтага раскулачвання і спецыяльнага перасялення беларускага селяніна ў суровыя неабжытыя месцы, дзе яго чакалі дашчыста, наскрозь прадзімальныя паўночныя сцюдзёныя вятрамі баракі. Уладам патрэбна была працоўная сіла для вядзення лесанарыхтовак. І гэта нават не хавалася. У кніжцы прыводзяцца дакументы, у якіх даводзіцца: сем'і кулакоў, што не маюць у сваім саставе працаздольных мужчын, высяленню са сваіх родных мясцінаў не падлягаюць.

Што мелі беларускія спецперасяленцы на вялікім лесапавале? Якім было іх новае жыллё, ужо крыху зразумела. Не вызначаўся тлустасцю і іх харчовы паёк, наконт чаго ў кніжцы таксама прыведзены многія сведчанні. Холад і амаль паўгалоднае існаванне прыводзілі да высокай смяротнасці, асабліва сярод дзяцей. І асабліва па першым часе. Бо, як вынікае з аповеду, беларускі мужык, працавіты і загартаваны рознымі нягодамі, з цягам часу прыстасаваўся і на новых, суровых для нармальнага існавання месцах.

На заключэнне аўтар піша ў сваёй кніжцы: «Як крыўдна, што мы загубілі столькі жыццяў і змарнавалі столькі гадоў, пераварваючы, перакоўваючы, перавыхоўваючы адно аднаго, замест таго, каб будаваць краіну па натуральных чалавечых і эканамічных законах».

Яно і сапраўды на смак усё нядрэнна было. Адно — не зразумела, што гэта? «Пакруціў» наш мужык свой «ендзык» і выдаў:

— Прошэ пана, а цо ест тэн флякі?

— Крову веш? — спытаў гаспадар.

— Карову? — здзівіўся Іван. — Дык у мяне ж іх дзве!

— І млеко веш?

— Ды тры літры ў дзень выпіваю!

— А веш, сконт чловек млеко выціска?

— Вы-ым-я-а?! — ці не ўсе галосныя перапеў наш цікаўны і адчуў, як у роце ў яго... яно стала расці.

Аднак, гэта першая рэакцыя была, а пасля Іван зразумеў — тут іншая краіна, іншыя і стравы. А выйсце адно — альбо не есці таго, што не ведаеш, альбо, з'еўшы, ужо не пытацца.

А. Ліпень,

Іўеўскі раён

Трэба крычаць. І плакаць

...Некалі, магчыма, я буду ўспамінаць гэтыя гады, як найлепшыя, бо ў нейкіх трох кіламетрах на поўдзень ад мяне жыве мая дачка з зяцем і маленькай унучкай, у трох кіламетрах на поўнач — мая матуля. У будні мы пастаянна тэлефануем адна адной, пастаянна ў нечым выручаем, а ў выхадныя, на святы любім проста збірацца разам і тады...

Гэта ўжо як правіла — дачка заўсёды знойдзе за што пасварыцца на ўнучку, я — зазначыць, што некалі такой жа «шкодай» была яна, а мама — што і я... таксама не лепшай. Карацей, усе мы ў маленстве выкідвалі нейкіх конікаў. Адзін эпізод.

Гадоў у сем-восем мама завезла мяне ў вёску, каб я там папіла сыродою, пакупалася ў рэчцы, паела ягад, падыхала чыстым паветрам — як зараз кажуць — аздаравілася. Для гэтага там усе ўмовы былі — рэчка, карова, града трускалак, лес...

І дзед, які пастаянна загадваў нешта рабіць, — то яму двор падмяці, то карову папасі, то градЫ папалі, то курэй паганяй...

У той дзень яму заманілася нейкае бярвенца папілаваць. Падняў ён яго на козлы, прыладжыў левую руку там, дзе трэба адрэзаць, наставіў вялікую двухручную пілу. Я ўжо ведала, як яе трэба цягаць, але ж мне не да гэтага было: я глядзела на вуліцу, дзе гулялі дзеці.

Ну, піла і саскочыла... Ды дзеду па левай... Да крыві. А правай ён за дубец ды па мне...

Не сказаць каб дужа балюча было, але ж крыўдна! Я заплакала і пабегла ў глыб двара, дзе жылі трусы — вушастыя, гладкія. Ім я вырашыла расказаць сваё гора — залезла ў клетку, аднаго злавіла, абняла і не заўважыла, як... заснула.

А дамоў у гэты час прыйшла бабуля, і першае ж яе пытанне было «дзе дзіця?».

Дзед расказаў. Пра ўсё, у тым ліку і пра тое, што з гадзіну ўжо, як мой след прастыў...

Пра дзіцячыя самагубствы тады ніхто нічога не чуў, але бабуля спужалася: хвілін праз пяць уся вёска ўжо была «на вушах»: мяне шукалі ля рэчкі, па хатах, па гародах, кустах... Марна — нідзе не было. Бабуля на чым свет стаіць лаяла дзеда!

Ад гэтага крыку я прачнулася. Але ж з клеткі вырашыла не выязіць, бо думала, што дастанецца і мне...

А потым, адсварыўшыся, бабуля заплакала — горка, адчайна. І так мне яе стала шкада, што я вылезла. Я — знайшлася!

З таго часу дзед (светлай памяці... І нізкі паклон яму!) па-ранейшаму прывучаў мяне да работы. Але ўжо не дубцом. А бабуля проста шкадавала.

Можа, так і павінна быць у сапраўднай вялікай сям'і?

Людміла Вага,

г. Віцебск

«І каб хвосцік круціўся!»

Мая маці ўсё жыццё пражыла ў вёсцы, толькі пад старасць перабралася ў наш гарадок — бліжэй да дзяцей. Але звычак сваіх не пакінула: з кожнай пенсіі стала адкладваць нейкую капейку, каб увесну купіць парасят. Маўляў, за лета і восень яны падгадуюцца — свежына свая будзе.

І вось тая вясна надышла, і зяць ёй узяўся паспрыяць: у пакупцы.

— Ты ж толькі глядзі, — павучала яго матуля, — браць трэба белых, каб прыгожая скурка на сале была, браць трэба з аднаго гнязда, каб яны між сабою не грызліся, браць трэба вясёлых, рухавых, і каб хвосцік круціўся, браць трэба, каб на скуры, крый Бог, каросты не было, браць трэба (неўпрыкмет!) прыгаршчы саломы з воза, каб вяліся...

Зяць стаміўся ўсё гэта слухаць.

— Не зломак, — сказаў, — неяк выберу. А вы ж глядзіце, каб замочка была!

Назаўтра прыцемкам мы завялі свой МТЗ-80 і паехалі на базар. Аббегалі там усё! Купілі. Парачку... Завязалі кожнага ў асобны мяшок, закінулі на прычэп, едзем, нават, лічы, прыехалі ўжо, азіраюся назад — і душа ў пяты: адно парася з мяшка вылезла і на кучы смецця (напярэдадні мы двор ачышчалі і не выкінулі), як на пастаменце стаіць.

Муж спыніўся, удваіх залезлі на прычэп, каб злавіць яго, усадзіць у мяшок, а яно... на зямлю — і ходу!

Што далей было, трэба было бачыць: парася пабегла ўздоўж бетоннага плоту, муж за ім, я следам. З-за павароту яшчэ матацыкліст нейкі выскачыў. Я яму крычу: «Памажы!». Думала, ён наперад забяжыць. А ён на тарахцелцы сваёй рашыў... заехаць.

Ад чаго парася яшчэ больш спужалася, вушкі злажыла і — куляй. І плот, як на грэх, канчаецца. А за ім — палігон.

На наша шчасце, перад ім невялікая ямка была. Парася ў яе... Муж на яго... Сабою накрыў. Злавілі!

Прывезлі дамоў, пусцілі ў хлеў (маме сказалі, каб глядзець не ішла пакуль), завіталі ў хату «стрэс зняць». Пасядзелі там крыху — і ходу.

Праз колькі там часу — званок. Мама з плачам:

— Дзеткі, куды ж вы глядзелі? Хворае парася вам падсунулі: і спінка абадраная, і хвосцік не круціцца, і, мусіць, краснуха ў яго — нейкае чырвона-сіняе ўсё... А вы такія грошы ўляпілі! Лепш бы я сама, пехам на базар пайшла, лепш бы на спіне прыцягнула...

Мы з мужам вінавата маўчалі, чакалі, што будзе далей.

А далей — кабанчык аддыхаўся, адляжаўся, сінякі прайшлі. І на Каляды ў цешчы зяць еў свежыну: усё было, як мама і хацела.

Т. Дуброўская,

г. Мар'іна Горка

Сіла... смеху

З будучым мужам мы пазнаёміліся на бульбе. Я тады вучылася на трэцім курсе педагагічнага, ён...

У першы ж вечар ён запрасіў мяне танцаваць — адзін раз, потым — другі, трэці. «Хоць трактарыст, але твой!» — сталі смяяцца з мяне дзяўчаты. Я ж нічога смешнага ў гэтым не бачыла — хлопец як хлопец, трактарыст дык трактарыст. Адзінае, што непакоіла — ён маўчаў увесь час... Але сяброўкі мае і тут знайшліся, сказалі, што ён альбо бяззубы, альбо трох словаў звязаць не можа.

Але ж на трэці вечар мы неяк разгаварыліся, і высветлілася, што завуць яго Слава, Міраслаў, што скончыў ён... політэхнічны інстытут, жыве і працуе ў Мінску, што гэты калгас — іх падшэфны, і ён тут сапраўды кіруе трактарам. Вось так, на зайздрасць дзяўчатам, пачалося наша сяброўства, наш раман.

Развіваўся ён досыць імкліва. На каталіцкія Каляды, якія ў нас тады «ніхто не адзначаў» Слававы бацькі запрасілі мяне ў госці. Я разумела, што гэта такое: спецыяльна пашыла сукенку, напяклА ў інтэрнаце рагалікаў, зрабіла прычоску. І ад гэтага яшчэ больш хвалявалася. Але прынялі мяне вельмі цёпла, як сваю, як родную.

Назаўтра ж па тэлефоне я расказала пра гэта маме, і мы разам вырашылі, што на нашы Каляды Славу можна запрасіць да нас.

Чаго гэта каштавала, уявіць цяжка, але да нашага прыезду мае бацькі (маме тады 55 было, тату на 12 больш... Я ў іх позняя...) пераклеілі ўсе шпалеры, купілі (даталі недзе!) круглы стол і канапу з крэсламі, на падлогу пасцялілі дыван («каб па-гарадскому было»), а ўжо што стаяла на стале...

Мы нешта елі, пілі, размаўлялі. Усё было проста цудоўна, а потым Слава выйшаў з-за стала, каб уключыць музыку, і я ўвачавідкі ўбачыла, што настрой у бацькі рэзка сапсаваўся: ён пацямнеў тварам і проста «выпаў» з агульнай размовы — здавалася, нікога не бачыў, нічога не чуў. Устаў, пайшоў у сенцы курыць.

Я выйшла следам. Пытаюся:

— Тата, нешта не так? Што з табою?

А ён, бачу, ледзьве не плача. Кажа:

— Дачушка, ты ж у мяне разумніца... Можа не позна яшчэ? Можа ты за яго не пойдзеш?

— Чаму?! — пытаюся.

— Ды на нас з маці, — кажа, — надзея малая — старыя мы, мала чым вам дапаможам. А ён хлопец, можа, і не благі, але ж надта бедны.

— З чаго ты ўзяў, тата?! Звычайны ён!

— Не, дочка, ты вочкі разуй, ты паглядзі — у яго ж праз шкарпэткі пяты блішчаць...

Вярнулася я ў хату. Слава ля этажэркі стаіць — у шкарпэтках (трэба ж разувацца, калі дыван на падлозе?)... У дзіравых.

Я вочы вылупіла, гляджу, а ён бесклапотна так усміхаецца, пытае ў мяне, калі маёй рукі лепш папрасіць — сёння ці заўтра?

Ну, у мяне і сарвалася (за бацьку дужа ж крыўдна было!):

— На святое ніколі!.. Ты што, едучы сюды, не мог цэлыя шкарпэткі надзець?!

Такім разгубленым Славу я ніколі не бачыла: твар яго запалаў, вусны і рукі затрэсліся. На ногі зірнуў, кажа:

— Ды гэта ж новыя! Першы раз надзеў!.. На іх яшчэ паперка зранку была. Ты мне не верыш?

Я — паверыла і залілася смехам. Да яго, хоць і не адразу, далучыўся Слава, да нас — мама і нарэшце — бацька.

Што датычыцца шкарпэтак, то іх, відаць, (мы разам рашылі), альбо выпусцілі з нейкім бракам, альбо захоўвалі абы як — не ўяўляючы, колькі дроў магло б наламацца з-за такой драбязы, калі б...

Калі б не чароўная сіла смеху.

У той жа год, вясною мы згулялі вяселле, у нас нарадзілася двое сыноў, якім бацька заўсёды, з задавальненнем расказвае гісторыю свайго сватаўства.

Што яшчэ мо цікава, з той самай пары ён ніколі не купляе адну пару шкарпэтак, абавязкова — дзве. І квіток пакідае, каб, калі што, можна было выставіць прэтэнзіі.

Наталля М.

г. Мінск

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Беларусы вызваляюцца ад эпідэміі прастудных захворванняў...

Дзясяты тыдзень доўжыцца ў Беларусі эпідэмія грыпу і вострых рэспіраторных вірусных захворванняў. Па стане на ўчарашні дзень супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы ахапілі 12 раёнаў: Аршанскага, Лепельскага, Ельскага, Калінкавіцкага, Шклоўскага, Слаўгарадскага, Быхаўскага, Бялыніцкага, Пухавіцкага, Салігорскага, Смалявіцкага і Валожынскага. Навучанне спынена ў трох школах.

За тыдзень з 16 па 21 сакавіка ахвярамі прастуды сталі 67 308 жыхароў кантрольных гарадоў, а гэта на чвэрць менш, чым на папярэднім тыдні. Такім чынам, ёсць надзея, што кропка ў эпідэміі будзе пастаўлена яшчэ да канца сакавіка....

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Я ЦЯБЕ ЗНІШЧУ!»

Такія вось пагрозы час ад часу сыплюцца паміж людзьмі, якія раней кахаліся-мілаваліся ці проста з'яўляюцца сваякамі. Напрыклад, у Мазыры адзін мужчына 56-гадовага ўзросту накінуў сваёй сужыцельцы вяроўку на шыю і пагражаў задушыць. А «прымак», якому споўнілася трыццаць гадоў, з вёскі Лапаціна, які нідзе не працаваў, пагражаў сыну сваёй сужыцелькі смерцю за тое, што хлопец з'яўляецца «шкодным элементам».

Некалькі разоў лупцаваў сваю сястру нідзе непрацуючы і раней асуджаны 23-гадовы мазыранін. Калі ж ён заявіў ёй, што загоніць у труну, тая звярнулася ў міліцыю. Гэтак жа зрабіла і жыхарка адной з вёсак Жлобінскага раёна ў дачыненні да свайго мужа. Па ўсіх гэтых пагрозах узбуджаны крымінальныя справы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РАБАЎНІК ЗАТРЫМАНЫ

У гарадскім пасёлку Касцюкоўка, што побач з Гомелем, да 68-гадовай грамадзянкі ў дом зайшоў невядомы грамадзянін. Падставай для размовы з жанчынай стаў магчымы продаж бульбы. Але ж гутарка закончылася зусім іншым чынам. Мужчына гвалтам забраў 100 тысяч беларускіх рублёў і знік. Праз два дні яго асоба была вызначана, а сам 29-гадовы жыхар гэтага ж населенага пункта затрыманы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ХАВАЎСЯ ТРЫ ГАДЫ

У Баранавічах затрымалі грамадзяніна Украіны, які ў 2006 годзе забіў чалавека ў Сумскай вобласці.

Затрыманы тры гады пражываў у знаёмай і спакойна рамантаваў аўтамашыны на СТА.

Пашпарта ў яго не было, і мужчына выдаваў сябе за расіяніна.

Па адбітках пальцаў было вызначана, што затрыманы знаходзіцца ў міжнародным вышуку.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Бяседны песні ГАДЗІНА ПІК

Вобразна, нават афарыстычна, перададзена сутнасць нашага часу, імклівага, мітуслівага, супярэчлівага, у песні «Гадзіна пік» Уладзіміра Мазго і Якава Навуменкі. І цягнік успрымаецца сімвалічна: выступае мастацкім увасабленнем долі — той прыроднай наканаванасці, якую мы мусім спазнаць і творча выявіць. Але з-за неўпарадкаванасці руху, віхурнасці ў грамадзе і долі не прабіцца да нас...

З часу стварэння песні рэчаіснасць стала яшчэ больш дынамічнай, напружанай, зменлівай. Таму песня актуальна гучыць і на бяседзе, і ў юнацкім асяродку.

Як кампазітар Якаў Навуменка актыўна супрацоўнічае з беларускімі паэтамі. Ён паклаў на музыку шмат вершаў А. Бадака, А. Зэкава, У. Мазго, А. Фіялкоўскай і іншых і гэтыя песні ўключыў у свой рэпертуар.

Верш Уладзіміра Мазго

Няўмольны час, імклівы час
Хвалюе нас, бунтуе нас.
Ці ён бяжыць, ці ён ляціць,
А не суняць, а не спыніць.
Я так спяшаў і не паспеў,
У свой вагон у час не сеў.
Спазніўся я — пайшоў цягнік.
Віною — ты, гадзіна пік...

Прыпеў:

Гадзіна пік, гадзіна пік.
Спяшаю я на свой цягнік,
Пакуль цягнік з вачэй не знік.
Віною — ты, гадзіна пік!..
А час надзей, а час падзей —
То дабрадзей, то ліхадзей.
І кола дзён як ні круці —

Музыка Якава Навуменкі

Спазніцца можаш у жыцці.
І мары дзён, і сны начэй —
Усё хутчэй, усё хутчэй.
І разабрацца цяжка мне:
Наяве гэта ці то ў сне?..

Прыпеў.

Нясе матор, вязе матор,
А там — наперадзе — затор.
І, не міргаючы, ва ўпор
Глядзіць чырвоны святлафор.
Цягнік спазніўся. Я паспеў
І ў вагон патрэбны сеў,
Заняўшы месца ля вакна,
Адкуль гадзіна пік відна.

Прыпеў.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

ЗАДОРЬЕВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, расположенных на территории Задорьевского сельсовета:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка	Наличие ограничений в использовании земель	Расходы по подготовке документации	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Амнишево, участок № 5 623281300101000039	0,2500 га	водоохранная зона реки Лонва 0,2500 га	1410714	2500000	25000
2	д. Амнишево, участок № 6 623281300101000040	0,2153 га	водоохранная зона реки Лонва 0,2153 га	1410714	2153000	21530
3	д. Амнишево, участок № 7 623281300101000041	0,2000 га	водоохранная зона реки Лонва 0,2000 га	1410714	2000000	20000
4	д. Амнишево, участок № 8 623281300101000042	0,1995 га	водоохранная зона реки Лонва 0,1995 га	1410714	1995000	19950
5	д. Амнишево, участок № 9 623281300101000043	0,0850 га	водоохранная зона реки Лонва 0,0850 га	1410714	850000	8500
6	д. Выгор, участок № 1 623281302601000015	0,2500 га	—	1410714	356250	3560
7	д. Выгор, участок № 2 623281302601000014	0,2500 га	—	1410714	356250	3560
8	д. Печное, участок № 6 623281310601000010	0,0770 га	—	1410714	132770	1327

Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619030031 в филиале 611 АСБ Беларусбанк Логойск, код банка 518, УНП 600181628. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти)

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (25 сакавіка). Па гарызанталі: Краншпэп. Шквал. Плёс. Намібія. Арама. Ордэр. Марс. Рубанак. Умалот. Каза. Тэбрыз. Мальта. Урал. Бэн. Індыга. Панама. Акот. Душа. Рак. Ліхтар. Брама. Пано. Сляб. Асоба. Штора. Карыятыда. **Па вертыкалі:** Вялікабрытанія. «Бітлз». Набоб. Удача. Рурык. Манты. Агора. Золата. Бок. Лат. Шэкспір. Пясок. Ляда. Аборa. Эфа. Бар. Лесаруб. Палова. Шаша. Замак. Нюх. Малацьба. Мароз. Тэмза. Старана. Раніца.

Сканворд (26 сакавіка). Па гарызанталі: Трэнер. Лязо. «Дынама». «Рэал». Аўтарытэт. Арка. Азарт. Амур. Трыстан. Кіраса. Брат. Клопат. Гарпун. Ірак. Ава. Бора. Мастак. Клімат. «Рома». Бар. Рэглан. Адана. Поп. Акунь. Кракі. Атожылак. **Па вертыкалі:** «Спартак». «Лакаматыў». Трыко. Ібіс. Паром. Рэтра. Араб. Радопы. Таката. Тан. Рапарт. Нарэз. Дока. Этан. Апука. Замша. Ніт. Латка. Мараль. Газа. Скарб. Сіг. Амар. Пат. Уса. Увага. Патратунак. Націск.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.52	18.38	12.46
Віцебск —	5.41	18.28	12.47
Магілёў —	5.45	18.28	12.43
Гомель —	5.40	18.23	12.43
Брэст —	6.08	18.53	12.45
Гродна —	6.09	18.52	12.43

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Дзмітрыя, Міхаіла, Нікандра.*
К. *Анелі, Яны, Аляксандра, Антона, Яна.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Дзве даты

28 сакавіка

1919 год — нарадзілася Вера Палтаран, беларуская пісьменніца, заслужаны работнік культуры Беларусі. Працавала ў газетах «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», часопісе «Маладосць». Аўтар зборнікаў нарысаў «Ключы ад Сезама», «Дзевясіл». Пісала пра творчасць Алеся Адамовіча, Івана Пташнікава, Івана Мележа і іншых. Выступала як крытык і мастацкі перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1971 год — Волжскі аўтамабільны завод уступіў у эксплуатацыю, выпусціўшы першыя экзэмпляры аўтамабіля «ВАЗ-2101». Магутнасць чатырохцыліндравага рухавіка складала 60 к.с., максімальная хуткасць — 140 км/г. «Жыгулі» задумваліся як народны аўтамабіль, які пры параўнальна невысокай цане мог бы насыціць «ненасытны» савецкі аўтарынак.

Цытата дня

«Час ад часу чалавецтва адхіляецца ад лагічнай лініі свайго развіцця. Таму яно яшчэ існуе».

Габрыэль Лаўб (нар. 1928), чэшскі афарыст.

КЛЁВА!



ПРАВІЛЫ РЫБАЛОЎНАГА ЭТЫКЕТУ

Уявіце сабе карціну: вы са сваім таварышам па захапленні прыбылі на месца рыбнай лоўлі і, разабраўшы снасці і рыбацкую гаспадарку, падрыхтаваліся да лоўлі. Забытыя трывогі працоўнага тыдня, і вы атрымліваеце асалоду ад адпачынку, добрага надвор'я і перспектывы займальнай рыбалкі. Але тут у цішыні чуецца набліжэнне да месца вашай стаянкі шумнай кампаніі маладых людзей. Яна пачынае размяшчацца побач з вамі, у самай непасрэднай блізкасці, распакоўвае свае харчы, ставіць палаткі, пачынае сячы дрэвы для вогнішча. У кагосьці з гэтай кампаніі ёсць вуды, і яны бесцырымонна ўсаджваюцца побач з вамі, але неўзабаве, пакліканыя таварышамі, пакінуўшы ля вады снасці, накіроўваюцца да сваёй стаянкі. Пачынаецца выпіўка, якая працягваецца да поўначы, і чым далей, тым больш шуму. І ўсё гэта ў лепшым выпадку, калі вы не выказваеце незадавальнення блізкім суседствам такой кампаніі. Але калі вы страцілі цярпенне і вырашылі зрабіць заўвагу, то вынік можа быць яшчэ горшым.

Кожны чалавек, выязджаючы на рыбалку, можа спыніцца ў любым вольным месцы каля вадаёма для аматарскай лоўлі рыбы. Але калі пэўнае месца занятае рыбаловамі, якія прыехалі раней, ніхто не мае ніякага права аспрэчваць яго, спасылаючыся на тое, што месца гэта прыкормленае кім-небудзь, або на тое, што хто-небудзь ловіць тут пастаянна. Гэтае палажэнне трэба памятаць усім і не ствараць нездаровую сітуацыю на вадаёме спрэчкамі наконт месца.

Размяшчаючыся па суседстве з іншымі рыбаловамі, неабходна трымаць дыстанцыю, каб сваімі дзеяннямі не перашкаджаць адзін аднаму. Раней прадугледжвалася правіламі адлегласць, не меншая за 20 метраў, і варта сказаць, што гэта даволі мэтазгодна, улічваючы, што выкарыстанне сучасных снасцяў абумоўлівае далёкія закіды прынады, і блізка размешчаныя снасці будуць перашкаджаць адна адной, а калі рыба будзе брацца, могуць пераблытацца і парвацца.

Усе рыбаловы на вадаёмах — вашы калегі па захапленні, і ўсім неабходна выконваць элементарныя нормы ветлівасці: пры сустрэчы — павітацца, нават калі вы бачыце гэтага рыбалова ўпершыню, зварот павінен быць на «Вы», а ў гутарцы варта прытрымлівацца ўзаемнай ветлівасці і павагі незалежна ад узросту. І, вядома, павінны быць цалкам выключаныя з гутаркі словы і выразы, якія абражаюць годнасць чалавека, тым больш нецэнзурныя. Не стамляйце доўгай размовай суседа-рыбалова, бо не кожнаму хочацца размаўляць бесперапынна, многія прыязджаюць на рыбалку нацешыцца цішынёй на прыродзе, ды і не ўсе схільныя весці працяглыя гутаркі.

Зусім іншая сітуацыя, калі да вас звяртаецца з якой небудзь просьбай або пытаннем сусед. Тут трэба з усёй добрасумленнасцю пайсці яму насустрач, выручыць, калі ў яго ўзніклі цяжкасці, падзяліцца прынадай, кручкамі, грузілам і іншай дробяззю — вы і самі можаце апынуцца ў такім становішчы. Узаемная павага і ўзаемная выручка павінны быць законам для ўсіх рыбаловаў, але толькі ў тым выпадку, калі яна не выліваецца ў нясціплую апеку, у выродлівую форму сяброўскага ўдзелу. Напрыклад, калі вы заўважылі, што на снасці вашага суседа бярэцца рыба, а ён адышоў, не варта, узяўшы яго снасць, падсякаць і выважваць рыбу, а неабходна толькі хуткай паведаміць яму аб гэтым.

Усё, што знаходзіцца вакол рыбалова на вадаёме, павінна застацца ў недатыкальнасці. Нельга сячы і ламаць прыбярэжныя кусты, а тым больш дрэвы: для падставак і для вогнішча заўсёды можна сабраць сухастой і рэшткі ранейшых вогнішчаў. Калі ўжо неабходная палка са свежай драўніны (напрыклад, для кацялка), можна яе зрэзаць у хмызняку, не чапаючы дрэў, асабліва маладых. Калі з сабой бярэцца палатка, трэба браць і шасты для яе, і калы, а ў крайнім выпадку выкарыстаць паўзасохлыя часткі хмызняку, дзе ён моцна загушчаны.

Само вогнішча не варта разводзіць паблізу ад дрэў (асабліва хвойных), каб не папсаваць іх, а таксама з-за пагрозы ўзнікнення лясных пажараў. Калі ёсць месцы ранейшых вогнішчаў, лепш скарыстацца імі — менш пацерпіць берагавая расліннасць. Нельга здзіраць кару з бяроз для распальвання вогнішча, лепш загадзя назапасіць на выпадак дажджлівага надвор'я сухі спірт у таблетках, абрэзкаў пенапласту і г. д. Акрамя таго, неабходна ведаць, што дробныя сухія галінкі хмызняку (яны ламаюцца з трэскам) вельмі зручныя для распальвання вогнішча. Нават мокрыя ад дажджу, яны з падкладзеным пад іх кавалкам газеты хутка загараюцца. Паступова падкладваючы на іх пласт галінак (пажадана з сухастою) і павялічваючы дыяметр гэтых галінак, можна дамагчыся добрага разгарання вогнішча нават пры невялікім дажджы.

(Працяг будзе.)

Майстэрня

ПЕРАНОСНАЯ ВЯНДЛЯРНЯ

Вяндлярня ўяўляе сабой цыліндр з дном з лісцевага жалеза. Усярэдзіне вяндлярні прыклёпваюць або прыварваюць два вугольнікі, на якія ставяць бляху.

Варыянт 1. Гэты ўніверсальны самаробак *(мал. 1)*, які выкарыстоўваецца для гарачага вэнджання рыбы і мяса, можна з поспехам ужываць у лодцы замест чарпака, а ў халодны час года — як печку для палаткі (калі ў яе памясціць гарачыя пясок, попел, вуглі з вогнішча і зачыніць наглуха накрыўкай, цеплыня захаваецца на працягу некалькіх гадзін).

У накрыўцы ёсць адтуліна, велічыня якой рэгулюецца заглушкай. Дыяметр вяндлярні — 300 мм, даўжыня — 450 мм (памеры могуць быць зменены ў залежнасці ад умоў вэнджання).

Варыянт 2. Гэтая пераносная паходная вяндлярня зробленая з белай бляхі або нержавеючай сталі таўшчынёй 0,3—0,5 мм і ўяўляе сабой скрыню з накрыўкай *(мал. 2)*. Усярэдзіне скрыні на вышыні 150 і 250 мм прыклейваюць вугалкі-ўпоры, на іх усталёўваюць дзве рамы з буйной сеткай. На дно вяндлярні насыпаюць роўным пластом дробныя сухія галінкі алешыны або пілавінне дрэў ліставых парод.

На сеткаватыя рамы ў адзін пласт укладваюць нацёртыя соллю тушкі рыбы або кавалкі мяса, накрываюць вяндлярню накрыўкай і ставяць на вогнішча на 20—30 хвілін. Паколькі доступ кіслароду закрыты, паліва на дне вяндлярні не загараецца, а стварае шмат дыму, які выходзіць праз шчыліны і зазоры ў накрыўцы.



1 *— корпус з нержавеючай сталі,* ***2*** *— рамы з буйной сеткай, на якіх раскладваюць рыбу,* ***3*** *— вугалкі-ўпоры,* ***4*** *— накрыўка.*

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Нешта з памяццю маёй стала

Каму не пагражае пагаршэнне памяці? У першую чаргу тым, хто вядзе актыўны і здаровы лад жыцця, займаецца разумовай працай ці проста трэніруе памяць. Што ж рабіць тым, хто пачаў страчваць яе, хто імгненна ўсё забывае і становіцца няўважлівым? Адназначна: неабходна змагацца з гэтай хваробай.

Сёння існуюць розныя медыцынскія прэпараты, якія паляпшаюць памяць, аднак мы прапануем пагаварыць пра тое, што можна зрабіць самастойна, не ўжываючы лекаў, ці, прынамсі, дапамагчы медыкаментознаму лячэнню.

Трэніруйце памяць кожны дзень

Ёсць некалькі эфектыўных практыкаванняў, якія трэба выконваць штодня для паляпшэння памяці.

- Лічыце ад 1 да 100, пры гэтым усе лічбы, дзе сустракаецца, напрыклад, лічба 4 (ці якая-небудзь іншая), замяніце на слова «стоп» (ці любое іншае). Напрыклад: адзін, два, тры, стоп, пяць і г.д. Затым палічыце ў адваротным парадку. Памяняйце лічбу. Можна адразу дзве ці некалькі лічбаў замяніць рознымі словамі. Такое практыкаванне *вучыць канцэнтраваць увагу, робіць больш засяроджаным.*
- Паспрабуйце апісаць каму-небудзь рэч, партрэт, пейзаж ці інтэр'ер, не называючы гэты прадмет. Успомніце як мага больш дэталяў. Чым лепш вы апішаце, тым хутчэй ваш суразмоўца адгадае загадку. Гэта практыкаванне *прывівае ўменне дакладна заўважаць дэталі, звычку звяртаць увагу на важныя дробязі.*
- Падрыхтуйце ліст паперы і ручку. Правай рукой бесперапынным рухам намалюйце круг. Потым левай рукой прымалюйце да круга справа вертыкальную рысу, рабіце гэта таксама бесперапынна зверху ўніз. Потым злучыце рухі правай і левай рук — малюйце адначасова. Рабіце гэта 10 секунд, затым 15, 20 і гэтак далей. Такім спосабам вы зможаце *трэніраваць каардынацыю рухаў рук. Паўшар'і вашага галаўнога мозгу будуць працаваць больш узгоднена.*
- Завучвайце на памяць добрыя вершы, выбірайце тыя, якія спадабаюцца вам.

Знайдзіце справу па душы

Зразумела, каб захаваць памяць, адных толькі практыкаванняў мала. Каб ваша памяць заўсёды знаходзілася ў баявой гатоўнасці, трэба перагледзець увесь свой лад жыцця. Хто з радасцю займаецца любімай справай, з задавальненнем ходзіць на працу, у таго значна больш шанцаў падтрымліваць сваю памяць у добрай форме.

Ну а калі працоўны стаж ужо ў мінулым ці праца не прыносіць асаблівай радасці? Тады тэрмінова шукайце справу па душы. Займіцеся, напрыклад, вывучэннем замежнай мовы. Часцей бывайце на свежым паветры, хадзіце хуткім крокам. Гэта ўмацоўвае сценкі сасудаў, што дабратворна ўплывае на памяць.

Пазбягайце стрэсаў, ганіце прэч адмоўныя эмоцыі — яны звужаюць сасуды, станчаюць іх. Не ешце прадукты, якія садзейнічаюць газаўтварэнню. Уключайце ў рацыён прадукты, якія паляпшаюць памяць: моркву, шпінат, апельсіны, інжыр, чорныя разынкі, фінікі, міндаль, грэцкія арэхі. Акрамя таго, народная медыцына ведае некалькі даўнейшых спосабаў паляпшэння памяці.

Народныя рэцэпты

- Паляпшае памяць карэнішча аеру. Вазьміце 1 ст. лыжку парашку сушанага аеру, раздзяліце на 3 часткі, прымайце, запіваючы гарачай вадой, за 30—40 хвілін да яды. Курс лячэння шэсць тыдняў. Пасля трэцяга тыдня зрабіце сямідзённы перапынак.
- Зранку і ўвечары з'ядайце па 0,5 ч. лыжкі мёду з невялікай колькасцю (на кончыку нажа) парашку аеру.
- У роўных частках змяшайце мелісу і маяран. Заліце 1 ст. лыжку шклянкай кіпеню. Прымайце па 1 ст. лыжцы 3—4 разы ў дзень.

-2563-

УТУЛЬНЫ ДОМ

Хай ваша мэбля заблішчыць

Часта мы праходзім міма паліц з паліролямі для мэблі, бо лічым іх нечым лішнім. Дарэмна, яны эканомяць нашы сілы і час, а мэбля ператвараецца ў амаль новую.

Паліролі для мэблі — рэч зручная і карысная. Галоўнае — правільна падабраць іх у адпаведнасці з матэрыялам, з якога выраблена паверхня. Напрыклад, такія модныя сёння ламініраваныя шафы лёгка вытрымліваюць «хімію», можна браць практычна любы сродак, у тым ліку і для пластыку. Лакіраванай мэблі патрэбны такія сродкі, якія не разбураюць пакрыццё і адначасова чысцяць і паліруюць. Асаблівай асцярожнасці патрабуе мэбля з натуральнага шпону. Аднак нават калі на этыкетцы напісана менавіта тое, што вам трэба, не спяшайцеся націраць любімы гарнітур — спачатку зрабіце праверку: нанясіце сродак на непрыкметны ўчастак, пратрыце і праз некалькі гадзін праверце, як паводзіць сябе пакрыццё.

НОВЫЯ ПАЛІРОЛІ

Сучасныя сродкі для чысткі прыбіраюць бруд і надаюць бляск. Сустракаюцца і такія, якія засцерагаюць паверхню. Вельмі эфектыўныя паліролі-антыстатыкі: яны ствараюць нябачную плёнку, якая адпіхвае пыл. З імі рабіць уборку давядзецца радзей. Самыя надзейныя і бяскшкодныя паліролі для мэблі не змяшчаюць агрэсіўных растваральнікаў і абразіўных рэчываў, маюць у сваім складзе пчаліны воск і натуральныя алеі. Сродкі з воскам не проста знімаюць бруд, але яшчэ і зацірaюць дробныя драпіны, робяць нябачнымі трэшчыны, словам, практычна рэстаўруюць нашу мэблю, надаюць воданепранікальныя і антыстатычныя ўласцівасці. Адзіная ўмова: іх лепш прымяняць на паверхнях, да якіх рэдка дакранаецеся рукамі, — на воску могуць застацца сляды ад пальцаў. Бываюць паліролі з нейтральным пахам, аднак часцей у іх дадаюць духмяныя рэчывы, якія, напрыклад, імітуюць тонкі кветкавы водар. Пасля ўборкі з такім сродкам у пакоі будзе прыемна, быццам у садзе. Форму флакона выбірайце на свой густ. Напрыклад, спрэй больш практычны за гель, наносіцца тонкім слоем, не патрабуе развядзення ў вадзе.

КАЛІ СРОДКУ НЯМА ПАД РУКОЙ

- Для асвяжэння мэблі можна падагрэць шклянку піва з кавалачкам воску і нанесці крыху цеплаватую масу на мэблю, даць ёй высахнуць, а затым нацерці шарсцяной анучкай.
- Калі на мэблю трапіла вапна ці мелавая фарба, пратрыце яе анучкай, намочанай у сумесі воцату з некалькімі кроплямі алею.
- Дробныя драпіны на паліраванай мэблі можна выдаліць, калі намачыць іх сумессю чырвонага віна і аліўкавага алею. Калі няма алею, вазьміце машыннае масла. Пасля таго як вадкасць злёгку ўсмокчацца, рэшткі ўватрыце кругавымі рухамі, а затым мяккай сухой анучкай натрыце паверхню да бляску.

КРУПІНКІ КЕМЛІВАСЦІ

Адным ударам малатка

Амаль у любога дачніка на ўчастку ёсць хоць якое-небудзь збудаванне з цэглы. З нагоды дробнага рамонту неяк няёмка запрашаць спецыяліста-муляра. Элементарны досвед работы з цэглай мае кожны мужчына. Адсутнасць неабходнага спруту можна кампенсаваць пры дапамозе розных прыстасаванняў, якія палягчаюць працу.

Здараецца, што нават у руках вопытнага муляра цэгла пры расколванні разбіваецца на дробныя кавалкі. Каб гэтага пазбегнуць, скарыстайце наступную прыладу. Яна складаецца з адрэзка трубы дыяметрам 20—30 мм, сагнутага ў форме падковы. Па ўнутраным баку вертыкальных стоек зрабіце прапілы, не даходзячы да нізу 3—4 см, затым устаўце ў іх кавалак стальнога палатна ад старой слясарнай пілы. Маючы такі інструмент, можна роўна разрэзаць цагліну ў любым месцы адным ударам малатка.

-2564-

Тэлесеткі

Калі жыццё — гульня

Элітарны клуб знаўцаў «Што? Дзе? Калі?» цяпер прапішацца і ў Беларусі. Вядучым інтэлектуальнай гульні стане Алесь Мухін — капітан каманды знаўцаў, уладальнік «Хрустальнай савы» (2004 год).

Папярэдні адбор прайшлі як будучыя ўдзельнікі (у іх лік трапілі, напрыклад, каманды вядомага гомельскага знаўцы Леаніда Клімовіча, «жаночая зборная» Алёны Павышавай, каманды Сяргея Буяна і Андрэя Супрановіча), так і заданні для інтэлектуалаў. На сайт тэлеканала АНТ, расказала прэс-сакратар канала Аліна Праваторава, прыйшло ўжо больш за тысячу пытанняў, зададзеных як школьнікамі, так і пенсіянерамі, хатнімі гаспадынямі, настаўнікамі і г.д. Каля 40 пытанняў рэдактары ўжо адабралі для гульні.

У красавіку пачнуцца здымкі першай серыі гульняў беларускай версіі «Што? Дзе? Калі?», якая неўзабаве трапіць у эфір. Прызавы фонд прэм'ернай серыі гульняў, адзначылі на АНТ — 30 мільёнаў беларускіх рублёў, кошт кожнага пытання ў гульні — 500 тысяч. А галоўным прызам у фінале стане хрустальная статуэтка... не, пакуль яшчэ не савы — савяняці.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

У «Беларускай часінкі» — новая вядучая

У папулярнай рубрыцы «Пытанне — адказ» інфармацыйнай праграмы «Беларуская часінка» з'явілася новая і, як спадзяюцца рэдактары, пастаянная вядучая Валянціна Мішынёва.

Зрэшты, зусім новым чалавекам на тэлебачанні Валянціну назваць нельга. У яе за плячыма сур'ёзны досвед работы ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь!». Апроч таго вядучая мае юрыдычную адукацыю, таму нават за непрацяглы час знаходжання ў новым амплуа ўжо дапамагла прафесійнай парадай многім тэлегледачам.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК, фота тэлеканала «ЛАД».

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Ракаў будуць спакушаць навізной, а Блізнят чакаюць новыя магчымасці

АВЕН. Могуць паступіць прапановы аб новай працы — перш чым іх прымаць і зрывацца з месца, добра ўсё прадумайце. Аптымістычны погляд на жыццё дазволіць лёгка справіцца не толькі са сваімі праблемамі, але і з праблемамі блізкіх людзей. У чацвер адбудзецца падзея, якая дазволіць умацаваць аўтарытэт на працы.

ЦЯЛЕЦ. Колькасць спраў на працы ўсё павялічваецца. Можа падацца, што ўсе сем дзён праведзяце ў працы без права на адпачынак, яду і сон. Не перажывайце: усе праблемы вырашальныя, калі праявіце сабранасць, уважлівасць і засяроджанасць. Не саромейцеся прымяніць свае веды на практыцы — гэта значна паскорыць справу.

БЛІЗНЯТЫ. Давядзецца сабрацца — спатрэбіцца стойкасць і, пажадана, няўразлівасць. Сябры засыплюць парадамі дыяметральна супрацьлеглага зместу. Спрабаваць іх прытрымлівацца, зразумела, не варта, але выслухаць можна — раптам сярод патоку слоў праслізне і здаровая думка. Адкрыйце сваё мысленне для перамен, не адмаўляйцеся ад новых магчымасцяў.

РАК. Магчыма ўсё: і прывабныя перспектыўныя прапановы, і папулярнасць у сваім асяроддзі, і падтрымка ўплывовых людзей. Аўторак можа быць звязаны са спакусай навізной. У гэты дзень добра быць у дарозе. Пастарайцеся да чацвярга не абвастраць адносінаў з калегамі — тады вас чакае поспех ва ўсіх пачынаннях.

ЛЕЎ. Тыдзень можа амаль не запатрабаваць напружання — яно будзе неабходна толькі ў той момант, калі задачай будзе проста не згубіць шанц. Вас чакаюць пазітыўныя змяненні на прафесійным полі дзейнасці, калі не забудзецеся: там, дзе няма прамога рашэння, як правіла, дапамагае дыпламатычнасць і гатоўнасць да кампрамісу.

ДЗЕВА. На стаўленне да службовых і прафесійных пытанняў станоўча паўплывае жаданне разнастайнасці і навізны. Аднак давядзецца прыкласці значныя намаганні, каб засяродзіцца на канкрэтнай справе і пастарацца давесці яе да канца. Пры ўдалым збегу абставінаў грошай стане больш — такім чынам вырашацца некаторыя праблемы.

ШАЛІ. Поспех запатрабуе значных затратаў сілаў і часу, але можаце разлічваць на дапамогу сяброў і блізкіх. Пастарайцеся ісці на разумны кампраміс з дзелавымі партнёрамі і калегамі — гэта вельмі дапаможа вырашыць службовыя праблемы. Тэмп работы лепш не павялічваць, а наадварот знізіць, калі так вам будзе зручней.

СКАРПІЁН. Ёсць шанц завесці каштоўныя знаёмствы. Гэтаму будзе спрыяць дар красамоўя, які раптоўна актывізуецца, і ўменне пераконваць навакольных. На працы давядзецца разлічваць толькі на ўласныя сілы і магчымасці. Вялікая верагоднасць з'яўлення дастатковай колькасці прывабных прапаноў. Пастарайцеся выбраць самыя вартыя з іх.

СТРАЛЕЦ. Ваша запаветная мара стане рэальнай: будзеце імкнуцца да яе — і зможаце яе дасягнуць. Перад вамі могуць адкрыцца новыя далягляды — яны будуць звязаны з новымі кірункамі ў справах. Магчымы юрыдычныя праблемы, вытокі якіх знаходзяцца ў нядаўнім мінулым. Аднак з імі ўдасца справіцца ў канцы тыдня.

КАЗЯРОГ. Добры тыдзень для рэалізацыі самых смелых імкненняў, але для поспеху неабходна такая якасць, як мэтанакіраванасць. Настройвайцеся на дасягненне мэтаў і пераадольванне цяжкасцяў. Тыдзень спрыяльны для людзей творчых прафесій. Трымайце ў тайне вашы справы, планы і задумы. Варта пазбягаць рызыкі і авантур у паездках і іншых мерапрыемствах, якія вынесены за межы дома ці офіса.

ВАДАЛЕЙ. Пачатак тыдня можа быць вельмі напружаным, таму запасіцеся цярпеннем і не рабіце ніякіх рэзкіх рухаў. Серада — спрыяльны час для вырашэння асабістых і службовых пытанняў. Ёсць вялікі шанц знайсці сродкі для рэалізацыі сваіх ідэй. Верагодны пазітыўныя перамены на працы.

РЫБЫ. Карысна будзе паразважаць і супаставіць прычыны і вынікі некаторых сітуацый, якія хвалююць апошнім часам. Не варта прымаць паспешлівых рашэнняў, будзьце больш разважлівымі і настойліва працуйце на сваю будучыню. У аўторак пачніце ажыццяўляць свае задумы: калі не выкарыстаеце гэты дзень, то складана будзе нагнаць тое, што прапусцілі.

Усміхнёмся!

— Дарагая, я зноў не магу знайсці свой гальштук! Куды ты зноў шафу пераставіла?!

☺

П'яны мужчына ўвайшоў у бар і замовіў віскі, сказаўшы, што жадае адсвяткаваць свой развод.

— Віншую, — сказаў бармэн. — Бачу, вы даўно ўжо святкуеце.

— Так, — з радасцю пагадзіўся той. — Дваццаць пяць гадоў!

☺

Антыкрызісныя карысныя парады. Старыя туфлі праслужаць даўжэй, калі не купляць новыя.

☺

— Падняць ветразь!

— Капітан, у нас судна з электрарухавіком...

— Падняць электрарухавік!

☺

Двое ў цёмным завулку.

— Грошы ёсць? — пытаецца адзін, дастаючы нож з кішэні.

— А што? — пытаецца другі, выцягваючы сякеру з-за пазухі.

— Ды так, размяняць хацеў.

ЗНОЎ «ПАЖАРНІКІ»

Мы ўжо неаднаразова паведамлялі пра судовыя пасяджэнні, на якіх разглядалася справа злачыннай групы так званых пажарнікаў, якая ўчыняла злачынствы на Гомельшчыне на працягу больш як дзесяці гадоў. Нагадаем, што каля пяцідзесяці чалавек ужо знаходзяцца, як кажуць, у месцах не вельмі аддаленых. Аднак арганізатарам банды ўдалося ў свой час знікнуць, і яны былі аб'яўлены ў міжнародны вышук. У канцы мінулага года трое з іх былі дастаўлены ў Гомель, і гэтымі днямі над імі пачаўся суд.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1665. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12